№ 4(34)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, красавік 2001 г.

## НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ „ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА” ПАД АКУПАЦЫЯЙ




*Пінск. Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”: Чарнобыльскі Шлях па рацэ.*

## СЛОВА Ў 15-Ю ГАДАВІНУ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ

Нашая нацыянальная гісторыя апошніх трохсот гадоў гэта ёсьць гісторыя народных катастрофаў і барацьбы за выжываньне. А пачалося ўсё з трагедыі XVII-га стагоддзя, калі велізарная маскоўская арда напала на Беларусь. З таго часу доўжыцца фізічнае вынішчэньне нашага народа маскоўцамі.

Цяпер мы перажываем найцяжэйшую сацыяльна-экалягічную Чарнобыльскую катастрофу, падрыхтаваную нам (асабліва на Магілёўшчыне) тымі ж маскоўцамі.

На працягу стагоддзяў вынішчэньня мы пераканаліся, як подла і ўмела выкарыстоўвалі нашыя ворагі ўсемагчымыя абставіны дзеля зьнішчэньня беларускіх людзей. Выкарыстоўвалі вайну, калектывізацыю, барацьбу са шпіёнамі ды „будоўлі сацыялізму”. ***Цяпер выкарыстоўваюць Чарнобыль.***

Створаныя і ствараюцца ўмовы для радыяцыйнага выміраньня беларускага насельніцтва, для страты здароўя беларускай нацыяй, для захворваньня беларускіх дзяцей. Усюды, дзе беларусы змагаюцца з вынікамі Чарнобылю, яны сутыкаюцца з адкрытым ці скрытым супроцьдзеяньнем уратаваньню нацыі.

Чарнобыльская катастрофа і яе вынікі выкорыстоўваюцца дзеля вынішчэньня беларусаў. ***Чарнобыльскі генацыд беларускага народу***

***ёсьць скрытая палітыка Масквы і адкрытая палітыка рэжыму Лукашэнкі.***

Мы мусім змагацца супраць гэтакай палітыкі. Усім трэба ведаць і разумець, што тактыка чарнобыльскага генацыду ёсьць, што яна існуе і падтрымліваецца ворагамі нашага народнага існаваньня.

З чарнобыльскім генацыдам павінны змагацца ўсе беларусы, усё нашае грамадзтва, незалежна ад палітычных перакананьняў.

Ратаваньне нацыі ад чарнобыльскага генацыду гэта ёсьць ратаваньне жыцьця. Гэта ёсьць сьвятое права і сьвяты абавязак чалавека.

Нас, беларусаў, нішто не павінна спыняць у нашым змаганьні з чарнобыльскім вынішчэньнем. І сёньня, у 15-ю гадавіну Чарнобыльскай трагедыі, хай моцна гучыць наш беларускі голас. Мы ўратуем сябе, і нашых дзяцей, і нашу краіну. Мы, беларусы, непераможныя, мы — бессьмяротныя. І нікому ня ўдасца нас зьнішчыць і перамагчы. З намі Бог і Бацькаўшчына, і сьветлая будучыня, у якой мы ўпэўненыя. Змагаймася ж за волю і незалежнасьць нашай краіны. Жыве Беларусь! Жыве вечна!

*Зянон ПАЗЬНЯК*
*Старшыня Беларускага Народнага*
*Фронту „Адраджэньне”*
*26 красавіка 2001 г.*

# ІДЗЕ ВЯЛІКАЯ ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ВАЙНА!

15 гадоў мінула пасьля катастрофы на Чарнобыльскай АС. Аднак яе наступствы для нас усё яшчэ ня сталі гісторыяй, бо яны моцна трымаюць у сваіх смяротных кіпцюрах наш народ.

Ужо відавочна, што **для беларусаў чарнобыльская навала па сваіх дэмаграфічных наступствах значна пераўзыходзіць Другую Сусьветную вайну, калі загінуў *кожны трэці* беларус**. Але яшчэ страшней тое, што мы ня ведаем, на колькі большую за вайну шкоду гэтая катастрофа нам прынясе ў пэрспэктыве, бо наступствы яе толькі разгортваюцца.

Каб ня быць галаслоўным, спашлюся на вынікі апошняга перапісу насельніцтва Гомельшчыны (1999г.). Паводле яго пабудавана так званая *дэмаграфічная піраміда,* якая адлюстроўвае структуру насельніцтва па ўзроставых групах (мал.1). У норме такая піраміда павінна мець шырокую *аснову*, масіўнае *цела* і вузкае *наверша*. Шырыня *асновы* залежыць ад колькасьці нованароджаных і дзяцей ва




***Мал.1. Структура насельніцтва Гомельшчыны па полу і ўзросту (Дэмаграфічная піраміда). Паводле перапісу 1999 г.***

ўзросьце да чатырох гадоў. Вышыня *цела* піраміды залежыць ад сярэдняй працягласьці жыцьця людзей, вышыня *наверша* — ад максімальнай працягласьці жыцьця доўгажыхароў. Плошча ўсёй піраміды прапарцыянальная колькасьці насельніцтва Гомельшчыны.

Вядома, што ў постчарнобыльскі пэрыяд народанасельніцтва нашай вобласьці няўмольна зьмяншаецца (мал.2). Гэта зьвязана зь няўхільным павелічэньнем сьмяротнасьці, зьніжэньнем нараджальнасьці і




***Мал.2. Дынаміка народанасельніцтва Гомельшчыны.***

скарачэньнем працягласьці жыцьця (мал.3). Як гэта адбілася на форме дэмаграфічнай піраміды, добра бачна, бо за апошнія 15 гадоў яна набыла выгляд падсечанага дрэва: яе *аснова* стала ўдвая вузейшая за *цела*! А гэта ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве азначае ***зьмяншэньне насельніцтва рэгіёна ўдвая***! (На малюнку 4 паказаны прагназуемы выгляд дэмаграфічнай піраміды Гомельшчыны. Бачна, што яе плошча ўдвая меншая за




***Мал.3. Дынаміка нараджальнасьці і сьмяротнасьці на Гомельшчыне. Дэмаграфічныя нажніцы ўтварыліся ў 1992 г.***

цяперашнюю.) Але такі прагноз справядлівы толькі ў тым выпадку, калі сітуацыю ўжо сёньня ўдасца стабілізаваць, калі ўдасца спыніць рост сьмяротнасьці і зьніжэньне нараджальнасьці. Калі ж стабілізаваць гэтыя паказчыкі ня ўдасца, дык можна чакаць ***поўнага выміраньня палешукоў***.

Ня будзе перабольшваньнем сцьвярджаць, што падобныя тэндэнцыі і прагнозы характэрныя і для іншых, пацярпелых ад катастрофы, рэгіёнаў краіны, і для ўсёй Беларусі цалкам, бо на мапе нашай краіны чарнобыльская навала ў літаральным сэнсе не пакінула „жывога” месца.

Прадбачу аргумант апанэнтаў, што пагаршэньне дэмаграфічнай сітуацыі на Гомельшчыне і па ўсёй Беларусі зьвязана ня толькі з мэдыка-біялягічнымі наступствамі катастрофы на ЧАЭС, але і з сацыяльнымі, эканамічнымі і палітычнымі фактарамі. І з такой тэзай нельга не пагадзіцца. У тэарэтычным пляне сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя фактары нашага жыцьця могуць у значнай ступені мінімізаваць наступствы радыяцыйнай катастрофы або ўзмацніць іх.

Бяруся сцьвярджаць, што ў нашым выпадку ***палітыка кіраўніцтва краіны (каляніяльнай адміністрацыі часоў СССР і Рэспублікі Беларусь) была скіраваная не на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай бяды, а на іх прыхаваньне, што ў значнай ступені і прывяло да дэмаграфічнай катастрофы, да выміраньня насельніцтва***.

Сапраўды, спачатку савецкімі, а пазьней беларускімі каляніяльнымі ўладамі, быў абраны подлы мэтад зьмяншэньня наступстваў аварыі на ЧАЭС, які можна зьвесьці да формулы**: „хто не нарадзіўся — той ад радыяцыі не памрэ”.** Адразу пасьля чарнобыльскай аварыі цяжарным беларускім жанчынам настойліва раілі пазбаўляцца ад плоду, бо нібыта рызыка нарадзіць „чарнобыльскага мутанта” была высокая. Такая рызыка, сапраўды, ў той час была больш высокая, чым звычайна, але ці падстава гэта для таго, каб пусьціць пад „нож” цэлае пакаленьне беларусаў? Безумоўна, не. Але працавала іншая, людажэрная лёгіка — лепш забіць 1000 здаровых плодаў, чым сапсаваць постчарнобыльскую статыстыку недахопаў разьвіцьця ад нараджэньня адным дадатковым „мутантам”! На малюнку нумар 3 стрэлкай адзначана рэзкае зьніжэньне нараджальнасьці ў 1987 годзе, якое звязана зь ня менш рэзкім павелічэньнем колькасьці „абортаў па мэдычных паказаньнях”.

Аднак адным годам усё ня скончылася. Пасьля адноснага „рэнесансу” 1988 года, калі нараджальнасьць трохі павысілася, назіралася далейшае ўстойлівае зьніжэньне паказчыка нараджальнасьці, зьвязанага са штучным яе стрымліваньнем. Стрымліваць нараджальнасьць было тым лягчэй, што да чарнобыльскага сіндрому (страх нарадзіць непаўнавартаснае дзіця) дадаліся эканамічныя і сацыяльныя праблемы (зьніжэньне ўзроўню жыцьця, разбурэньне сям’і), якія павялічылі няўпэўненасьць у заўтрашнім дні. На гэтым фоне нават невялікія сумненьні гінеколяга адносна разьвіцьця цяжарнасьці ўспрымаліся жанчынамі, як непасрэдны загад на выкананьне аборта. У выніку дайшло да таго, што сёньня ***з кожных трох зачатых плодаў беларусаў двух забіваюць у жываце маці***!!! Фактычна некалькі пакаленьняў беларусаў у літаральным сэнсе былі спушчаны ў бальнічны ўнітаз! Гэта небывалы ў сьвеце і ганебны факт. У кожным разе, Гітлеру такое і ня сьнілася.

Катастрафічнае зьніжэньне нараджальнасьці ўсе гэтыя гады адбывалася на фоне няўмольнага росту сьмяротнасьці і скарачэньня працягласьці жыцьця. У выніку чаго ў 1991-92 годах на Гомельшчыне ўтварыліся так званыя „дэмаграфічныя нажніцы” (мал.3), калі сьмяротнасьць дагнала, а пасля і перагнала нараджальнасьць. Тэмпы выміраньня людзей пачынаюць павялічвацца (мал.2). На цяперашні час адмоўны прырост насельніцтва вобласьці складае мінус пяць чалавек на кожную тысячу. Пры гэтым у асобных раёнах Гомельшчыны (Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Добрушскі, Лоеўскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі раёны) сьмяротнасьць ў два-тры разы перавышае нараджальнасьць, а адмоўны прырост складае мінус 10-15 чалавек на тысячу!

Якія ж захады прымаюць цяперашнія каляніяльныя ўлады ў сувязі са скарачэньнем насельніцтва? Паказальна, што яны спрабуюць выправіць дэмаграфічную статыстыку, не ратуючы беларусаў, а заахвочваючы калянізацыю Палесься прышлым элементам з усёй прасторы былога СССР. У 1997 годзе Гомельскі аблвыканкам з дазволу Саўміна прымае пастанову, па якой легалізуюцца, атрымліваюць работу, жыхарства, сацыяльныя гарантыі ўсе нелегальныя мігранты ў большасьці раёнаў Гомельшчыны. У выніку такой палітыкі ўладаў на Палесьсе пацягнуліся дзясяткі тысяч бежанцаў, бамжоў і беглых крымінальнікаў з Расеі, Таджыкістану, Афганістану, Узбекістану, Малдовы, гарачых кропак Каўказу… Па колькасьці мігрантаў Беларусь выйшла на вядучае месца ў Эўропе. Вось так на нашых вачах пад монаэтнічную Беларусь закладаецца бомба будучых міжэтнічных канфліктаў!

У структуры сьмяротнасьці Гомельскай вобласьці першае месца займаюць хваробы кровазвароту (56,6%), другое — новаўтварэньні (13,2%). І ў першым, і ў другім выпадках прасочваецца ўплыў радыяцыйнага фактару: вядома, што менавіта сэрца больш за іншыя органы інкарпаруе радыяцыйны цэзій, вядома таксама, што малыя дозы радыяцыі значна павялічваюць рызыку новаўтварэньняў.

За постчарнобыльскі пэрыяд значна скарацілася сярэдняя працягласьць жыцьця людзей, і асабліва мужчын (62 гады), якія ў большасьці не дажываюць да пэнсійнага ўзросту. Яшчэ горшая статыстыка працягласьці жыцьця вяскоўцаў.




***Мал.4. Прагназуемы выгляд Дэмаграфічнай піраміды Гомельшчыны ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве (паказана ў цэнтры дыяграмы). Аптымістычны варыянт разьвіцьця дэмаграфічнай сітуацыі прадугледжвае толькі (!?) двухразовае скарачэньне насельніцтва вобласьці.***

Нягледзячы на такія адмоўныя тэндэнцыі, каляніяльныя ўлады шмат гадоў фактычна ігнаруюць праблемы пацярпелых рэгіёнаў. Заганнай практыкай стала фінансаваньне так званых „чарнобыльскіх праграм” на 10-30% ад заплянаванага (ня кажучы ўжо ад неабходнага). Чарговая праграма з помпай прымаецца, закладваецца ў бюджэт, а пасьля не выконваецца. І так з году ў год. Прыкладам, толькі летась Веткаўшчына недаатрымала з чарнобыльскага фонду больш за 100 мільёнаў рублёў. Як вынік такой палітыкі, у пацярпелых ад аварыі Сьвяцілавічах за 15 гадоў ня здолелі нават наладзіць газіфікацыю, і мясцовыя жыхары па-ранейшаму гатуюць ежу на мясцовых жа радыёактыўных дровах у печах, ужо празваных у народзе „атамнымі міні-рэактарамі”. Ужо даўно ня йдзе нават гаворкі пра забесьпячэньне людзей чыстымі прадуктамі харчаваньня, вадой. Працягваецца сельскагаспадарчае і бытавое выкарыстаньне зоны адчужэньня. Нідзе пры правядзеньні сельскагаспадарчых работ не выконваюцца нават прымітыўныя мерапрыемствы, накіраваныя на ахову здароўя працоўных.

Характэрна, што за паўтары дзесяцігоддзі на дзяржаўным узроўні ніхто нават не паставіў задачу фармаваньня ў людзей постчарнобыльскай культуры — спэцыфічнага спосабу жыцьця (выжываньня) людзей, якія вымушаны існаваць ва ўмовах узьдзеяньня малых дозаў радыяцыі. Гэтаму ня вучаць дзяцей у школах. Гэтаму ня вучаць настаўнікаў і бацькоў. Таму і ***новае пакаленьне беларусаў таксама ня мае шанцаў на выжываньне***!

Падводзячы вынікі сказанага, можна канстатаваць, што:

— катастрофа на ЧАЭС нясе сьмяротную пагрозу беларускаму народу, які і па сёньня ня здолеў даць адэкватнага адказу на яе выклік;

— мэдыка-дэмаграфічныя наступствы атамнай катастрофы 1986 года для беларусаў ужо пераўзыходзяць наступствы Другой Сусьветнай вайны і ў пэрспэктыве пагражаюць нашаму народу выміраньнем;

— каляніяльная адміністрацыя нашай краіны праводзіць палітыку прыхаваньня наступстваў чарнобыльскай бяды, замест іх ліквідацыі, што спрыяе разгортваньню дэмаграфічнай катастрофы на Беларусі;

— эканамічныя, сацыяльныя і культурныя наступствы ўладарніцтва чужынцаў праяўляюцца ў эканамічным, сацыяльным і культурным заняпадзе краіны, на фоне чаго наступствы чарнобыльскай навалы павялічваюцца шматкроць.

Асэнсаваць праблему і выразна яе сфармуляваць — гэта важная частка справы, але яшчэ ня ўся, бо трэба таксама адказаць на пытаньне: як гэтую праблему можна вырашыць?

Абсалютна відавочна, што вырашэньне акрэсьленай праблемы

немагчыма ва ўмовах каляніяльнага існаваньня беларусаў. Калёніі для таго і патрэбныя, каб іх рабаваць. Таму каляніяльны статус Беларусі, яе палітычная і эканамічная падпарадкаванасьць Расеі не пакідаюць нашаму народу шанцаў на выратаваньне.

Вось чаму ***найпершай палітычнай умовай выратаваньня ёсць адхіленьне ад улады каляніяльнай адміністрацыі*** (незалежна ад таго, хто яе ўзначальвае сёньня і хто б яе ні ўзначаліў заўтра) ***і замена яе нацыянальным урадам***, які будзе непасрэдна зацікаўлены ва ўратаваньні нацыі, у сапраўднай ліквідацыі наступстваў аварыі.

Як паказвае вопыт нашых бліжэйшых суседзяў (Польшча, краіны Прыбалтыкі, Чэхія…), рэальная незалежнасьць гарантуе ўздым эканомікі і ўзроўню жыцьця насельніцтва, адраджэньне культуры, што стварае спрыяльны сацыяльна-эканамічны грунт для пераадоленьня наступстваў экалягічнай катастрофы.

***Нацыянальны ўрад павінен распрацаваць рэальную*** (а не дэкляратыўную) ***праграму ліквідацыі наступстваў аварыі і пасьлядоўна яе рэалізаваць***.

На мой погляд, у адным са сваіх разьдзелаў гэта праграма павінна прадугледжваць правядзеньне з дапамогай дзяржаўных СМІ інфармацыйнай палітыкі, накіраванай на давядзеньне да насельніцтва ўсёй небясьпекі пражываньня на забруджаных землях, усіх мэдыка-дэмаграфічных наступстваў катастрофы, а таксама прапаганду постчарнобыльскай культуры, авалодаць якой за кароткі час павінны ня толькі дзеці, але і дарослае насельніцтва. Дашкольныя і школьныя ўстановы краіны таксама павінны будуць заняцца фармаваньнем постчарнобыльскай культуры дзяцей і моладзі.

Адначасова давядзецца прыняць меры па даадсяленьню людзей з тэрыторыяў, дзе бясьпечнае пражываньне немагчымае, астатняе насельніцтва павінна быць забясьпечана радыяцыйна чыстымі прадуктамі харчаваньня і вадой.

Запатрабуе неадкладнага вырашэньня і задача павелічэньня нараджальнасьці і працягласьці жыцьця, а таксама зьніжэньня захворваемасьці і сьмяротнасьці насельніцтва… Але я не зьбіраюся выкладаць нейкую гатовую праграму, бо праблема, якая тут разглядаецца, мае агульнанацыянальны характар і павінна вырашацца на дзяржаўным ўзроўні, з прыцягненьнем лепшых беларускіх і замежных спэцыялістаў.

***Уладзімер СТАРЧАНКА***
***кандыдат педагагічных навук, намесьнік старшыні Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

* * *

***P.S.*** Фактычна на працягу 15 постчарнобыльскіх гадоў супраць беларусаў каляніяльнымі ўладамі вядзецца неабвешчаная прыхаваная вайна, мэта якой — зьнішчэньне беларускага народу, вызваленьне жыцьцёвай прасторы і засяленьне яе прышлым элемэнтам. Дзеля гэтага не выкарыстоўваюцца, як у ранейшыя часы, самалёты, танкі, агнястрэльная зброя, газавыя камэры і не будуюцца „асвенцымы". Хаця і пачалася яна ўвесну 1986 года якраз з таго, што савецкія ваенныя самалёты асаджвалі радыяцыйныя хмары на Гомельшчыну і Магілёўшчыну.

У эпоху інфармацыйных і палітычных тэхналёгіяў у гэтым няма патрэбы. Асабліва калі гаворка ідзе пра зьнішчэньне зрусіфікаванага за 200 гадоў каляніяльнага існаваньня „братняга" беларускага народу, якому нож пад сэрца можна засунуць, гледзячы проста ў вочы і гаворачы пяшчотныя словы пра вечную любоў і інтэграцыю. Нашы даверлівыя людзі ўсяроўна пярэчыць ня будуць. Не чачэнцы ж бо, што змагаюцца і паўстаюць.

***А ўсё ж такі, відаць, прыдзецца нам паўстаць на абарону сваіх дзяцей, бо іншага не дадзена!***

***Не паміраць жа на самой справе ад радыяцыі, інтэграцыі і каляніяльнай адміністрацыі!!!?***

# ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ. 15 ГАДОЎ.

***Менск***. Як і *25 Сакавіка*, у гадавіну Чарнобыльскай катастрофы ў Менску адбыліся два шэсьці: адно у цэнтры горада, якое арганізавалі *Народны Фронт* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ,* і другое — ад пляцу Свабоды да Акадэміі Навук, якое арганізавала так званая „аб'яднаная апазыцыя". І ў адным, і ў другім шэсьці ў час мітынгу выступоўцы казалі пра чарнобыльскую бяду, але ацэнкі розьніліся. Калі фронтаўцы раскрывалі экалягічна-палітычную сутнасьць Чарнобыльскай катастрофы як вялікай Чарнобыльскай вайны і мэтад вынішчэньня беларускай нацыі, то дэмакраты даводзілі адзін аднаму, што „Чарнобыль — наш боль" і што Лукашэнка нясе адказнасьць за пагаршэньне сітуацыі у чарнобыльскіх зонах.

На гэты раз на вуліцах не відаць было ні міліцыі, ні „спэцназу". Не было інцыдэнтаў. Калёна фронтаўцаў прайшла па праспэкце *Францыска Скарыны ад плошчы Незалежнасьці да Цэнтральнай плошчы* з песьнямі і беларускімі *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* ды плякатамі. На Цэнтральнай плошчы адбыўся кароткі мітынг.

"Беларусы мусяць падняцца, паўстаць. Рэжым павінен быць адхілены ад улады. І толькі тады мы зможам абараніць людзей ад наступстваў Чарнобылю", — сказаў на мітынгу намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Сяргей Папкоў***. Выступоўцы адзначалі таксама, што ніколі ў дні вялікіх нацыянальных сьвятаў і ў гадавіны вялікіх нацыянальных трагедыяў ня зыйдуць з цэнтру горада. „Нашыя дэманстрацыі ў вялікія дні Беларусі — стваральныя, яны мацуюць наш народ, кансалідуюць грамадзтва", — казалі дэманстранты.

***Баранавічы***. Несанкцыянаваны пікет арганізавалі сябры БНФ „Адраджэньне" і АГП. Каля 10 чалавек выйшлі на галоўную плошчу горада з жалобнымі плякатамі і сьвечкамі. Раздавалі газэты і ўлёткі на тэму Чарнобыля.

***Лёндан***. У Беларускай каталіцкай місіі *ў царкве Пятра і Паўла* адслужана літургія ў памяць ахвяраў Чарнобыля. (Адпраўляў апостальскі візітатар беларусаў грэка-католікаў замежжа айцец *Аляксандар Надсан*.) У набажэнстве бралі ўдзел беларускія студэнты і госьці Місіі.

***Магілёў***. Магілёўцы ўсклалі кветкі ля Чарнобыльскага крыжа, а вечарам выйшлі на цэнтральную вуліцу горада ў чарнобыльскіх плашчах і са сьвечкамі ў руках.

А 20-й гадзіне магілёўцы (і праваслаўныя, і каталікі) правялі ў праваслаўным саборы і ў касьцёле Сьвятога Станіслава паніхіды ў памяць па ахвярах Чарнобылю. Пасьля гэтага магілёўцы ўтварылі „жывы крыж" у цэнтры горада і гадзіну стаялі са сьвечкамі.

Міліцыя людзей не хапала, але паспрабавала спыніць калёну на пешаходным пераходзе, каб знайсьці арганізатараў. Ім патлумачылі, што калёна людзей са сьвечкамі ў руках не падыходзіць пад паняцьце „шэсьце і мітынг". Міліцыянты супакоіліся.

***Берасьце***. *Руская праваслаўная царква супраць Беларусі.* Мерапрыемствы да гадавіны Чарнобыля пачаліся з імшы за душы ахвяраў радыяцыі ў рымска-каталіцкай і грэка-каталіцкай парафіях.

У праваслаўным храме рускія папы не захацелі праводзіць богаслужэньне. Сьвятры Семіонаўскай царквы катэгарычна адмовіліся чытаць агульную малітву за Беларусь.

Гарвыканкам таксама забараніў правядзеньне ў Берасьці мітынгу і шэсьця з нагоды жалобнай гадавіны.

Але а 19-й гадзіне ў цэнтры горада пачалася несанкцыянаваная акцыя. Як і ў Магілёве, людзі вышлі на вуліцы з запаленымі сьвечкамі.

***Гомельшчына***. Улады *Мазыра, Рэчыцы, Сьветлагорску* не дазволілі праводзіць жалобныя мітынгі ў памяць ахвяраў Чарнобылю. Але людзі не зважалі на забароны. А 18-й гадзіне ***ў Мазыры*** мясцовыя актывісты правялі каля каплічкі насупраць гарвыканкаму гадзіну смутку па ахвярах радыяцыі. Яны запалілі сьвечкі, усклалі да каплічкі кветкі. Было шмат міліцыі, здымалі на відэастужку.




***Удзельнікі Чарнобыльскага Шляху на Цэнтральнай плошчы ў Менску.***

***У Калінкавічах*** і ***Рэчыцы*** сябры БНФ, АГП, Маладога Фронту раздавалі гараджанам няўрадавыя выданьні пра 15-я ўгодкі Чарнобылю.

***У Гомлі*** блізу 200 грамадзянаў (быў моцны дождж) прыйшлі ў сквер па вуліцы Савецкай на гадзіну смутку. Пад парасонамі гарэлі сьвечкі.

***Пінск***. У Пінску адбыліся два шэсьці. Адно — несанкцыянаванае *(Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ)* і другое, дазволенае ўладамі (недзяржаўныя арганізацыі, сацыял-дэмакраты, БНФ).

(*27 красавіка*. Міліцыя склала пратаколы на арганізатараў несанкцыянаванага жалобнага шэсьця 26 красавіка 2001 г. ***Лявона Вабішчэвіча*** і ***Ігара Саракавіка***.)

***Нью-Ёрк***. З нагоды 15-й гадавіны катастрофы Чарнобылю й у падтрымку акцыяў „*Чарнобыльскі Шлях*" у Беларусі нью-ёрскі аддзел ***БАЗА*** правёў *26-га красавіка* перад штаб-кватэрай ААН на 1-й Эвэню акцыю пратэсту супраць палітыкі рэжыму Лукашэнкі па ігнараваньні й замоўчваньні наступстваў катастрофы і супраць антыбеларускай, антыдэмакратычнай рэпрэсіўнай палітыкі рэжыму, якая ёсьць сапраўдным духовым, народазабойчым Чарнобылем.

У дэманстрацыі прынялі ўдзел некалькі дзясяткаў сяброў і прыхільнікаў *БАЗА,* якія трымалі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* й плякаты з надпісамі: „Чарнобыль і Лукашэнка — дзьве бяды Беларусі"; „Беларусь — найбольшая ахвяра Чарнобылю"; „Беларусі патрэбная дапамога сьвету". Старшыня аддзелу В.Зайка выступіў з прамовай пра наступствы Чарнобылю й пра ход акцыяў „Чарнобыльскага Шляху" ў Беларусі й за яе межамі: у Варшаве, Празе, Брусэлі, Лёндане ды іншых месцах, дзе беларусы ў гэты дзень праводзілі дэманстрацыі. Была зачытаная рэзалюцыя мітынгу, якую потым адаслалі ў кіруючыя ворганы ААН і МАГАТЭ. *(„Весткі і паведамленьні")*

***Віцебск***. Раніцай сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Раман Салаўян*** і ***Юры Карпаў*** пад *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* з чорнай стужкай некалькі разоў прайшлі па цэнтральнай віцебскай вуліцы Леніна, раздаючы прахожым улётку *Беларускага Вызвольнага Руху*, прысьвечаную Чарнобыльскай трагедыі. Міліцыянты іх не хапалі (не было, відаць, загаду).

Ля „сіняга дому" з плякатам „Чарнобыль — дзень смутку і болю" правялі пікет ***Уладзімер Плешчанка*** і ***Барыс Хамайда***.

У скверы каля пл.Леніна трэці пікет правялі гэтым часам іхныя сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Ян Талпыга*** і ***Пётра Сырапеня***. Тут пад *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* зьбіралі подпісы ў абарону беларускай незалежнасьці. Усюды распаўсюджвалася беларуская вызвольная літаратура.

***Ворша***. У Воршы адбыўся санкцыянаваны пікет *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* пад лёзунгам: „Радыяцыя ды „інтэграцыя" — гэта труна для беларусаў".

***Прага***. На Вацлаўскай плошчы Прагі прадстаўнікі беларускай эміграцыі і чэхі, якія падзяляюць Чарнобыльскі боль, правялі Чарнобыльскі Шлях пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* з чорнымі стужкамі.

***Барысаў***. Днём на могілках у вёсцы *Юшкавічы Барысаўскага раёну* ля месца пахаваньня ліквідатара ***Ганчарова*** адбыўся мітынг. Яго арганізавала вялікая група чарнобыльцаў.

***Брусэль***. Беларускі цэнтар арганізаваў пікетаваньне беларускай амбасады ў падтрымку Чарнобыльскага Шляху. Прысутнічала каля 30 чалавек пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*.

***(Па матэрыялах Беларускага Народнага Фронту"Адраджэньне", друку і радыё)***

## ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ НАД ПРЫПЯЦЬЦЮ

Традыцыйны *Чарнобыльскі Шлях* у Пінску, які прайшоў сёлета *26 красавіка,* быў уражлівы, як і раней. І ў той жа час, ён адрозніваўся ад мінулагодніх ранейшых акцыяў *Беларускага Народнага Фронту*. Тым часам мясцовыя ўлады спрабуюць перахапіць фронтаўскую ініцыятыву, каб выкарыстаць яе ў прапагандысцка-ідэалягічных мэтах, каб прыстасаваць гэтую акцыю на службу рэжыму. Ужо колькі гадоў запар „вертыкаль" робіць нешта падобнае, але на свой капыл: і вянок яны спускаюць (з цеплахода, недзе за горадам), і „чарнобыльцаў" запрашаюць, і нават школьнікаў — для масавасьці. Далучыцца ж да тых, хто зрабіў *Чарнобыльскі Шлях* у Пінску традыцыяй, не дазваляе гонар: быццам бы ўлада, а ініцыятары — Народны Фронт. Свайго сцэнару, лепшага, чым у фронтаўцаў, зрабіць ня могуць. Таму і разбураюць красавіцкую традыцыю ўсімі спосабамі, у тым ліку і з дапамогай мясцовага друку.

...Ізноў гучаў звон на вуліцах Пінска, ізноў ён нагадваў аб чорнай навале пад назвай „Чарнобыль". Звон будзіў памяць, звон дапамагаў не забываць пра ахвяры катастрофы, змушаў задумацца аб лёсе жывых...

Шэсьце Народнага Фронту спынілася ў парку на беразе Прыпяці пад гукі *Пагоні* ***Максіма Багдановіча*** . Традыцыйная „*Хвіліна маўчаньня"* была абвешчана *зь яхты „Сакавік"*, што прыплыла сюды па рацэ пад *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам.* Потым, калі людзі схілілі




***Чарнобыльскі Шлях па вуліцах Пінска.***

сьцягі, пад гучаньне моцнай сірэны, з борту яхты быў спушчаны вянок у плынь Прыпяці*. Хвалі падхапілі яго і ён паплыў у Чарнобыль, як вястун нашай памяці і ўзрушэньня.

***Я. ПІНЧУК***

---

* Падчас „Хвіліны маўчаньня" на Прыпяці зьявіўся нейкі човен. Мала хто зьвярнуў увагу на гэта (палічылі за рыбакоў). Толькі пазьней высьветлілася, што „аб'яднаная апазыцыя" таксама ладзіла „спуск вянка", чым спрабавала зрабіць свой „уклад" у справу ўладаў па разбурэньні Чарнобыльскага Шляху.

## ФАРС-2

*18 сакавіка* ў Беларусі адбыўся чарговы акт камэдыі-фарсу пад афіцыйнай назвай „давыбары ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу" (як называе Лукашэнка свой нелегітымны псэўдапарлямант).

Нагадаем, што на першым этапе гэтага фарсу ў кастрычніку 2000 г. большасьць насельніцтва краіны праігнаравала спэктакль і не пайшла на „выбары". Нават афіцыйнае тэлебачаньне прызналася ў дзень „выбараў", што яны не адбыліся (праўда, на наступны дзень дыктатар „выйграў падлік галасоў" і абвесьціў, што „выбары" адбыліся).

На гэты раз прапаганда ўжо не зрабіла памылкі і адрапартавала пра дружны ўдзел да 80% выбаршчыкаў. Аднак той, хто рабіў хаця б элемэнтарны падлік людзей, што ішлі на выбарчыя ўчасткі, мог зразумець, што нешматлікія пэнсіянеры (як вядома, дысцыплінаваныя галасоўшчыкі яшчэ са сталінска-брэжнеўскіх часоў) не маглі скласьці такую ўражальную колькасьць. Народ праігнараваў лукашэнкавыя „давыбары" ў „палатку".

У чарговы раз на „выбары" памкнуліся некаторыя лідары так званай „аб'яднанай апазыцыі". Акруга, дзе балатаваўся старшыня Народнай грамады **М.Статкевіч**, была заклеена і закідана плякатамі і ўлёткамі на расейскай мове (цяпер у гэтай партыі такая мова). Не дапамагло... Статкевіча ў „палатку" не дапусьцілі.

Была заўважаная таксама нештодзённая актыўнасьць супрацоўнікаў Кансультацыйна-назіральніцкай групы АБСЭ ў Менску, якія даўно настойліва выступаюць за арганізацыю назіраньня за „выбарамі" (найлепшы спосаб надаць фарсу легітымнасьць). Так, у Віцебск, дзе ў кастрычніку „выбары" не адбыліся зусім, ні на адной з акругаў, 18 сакавіка выязджаў супрацоўнік КНГ АБСЭ сп.Рывальде дзеля арганізацыі назіраньня. Пра гэта паведаміў друк.

Міжнародная актыўнасьць французкіх і, перш за ўсё, нямецкіх палітыкаў расьце на вачах. 12 сакавіка ў інтэрв'ю газэце „Народная Воля" дэпутат Эўрапарляманту Элізабэт Шродтэр (тая самая, што адказвае ў гэтай агульнаэўрапейскай структуры за стасункі з Беларусьсю) заявіла, што сярод патрабаваньняў АБСЭ да лукашэнкавага рэжыму ёсьць „пашырэньне паўнамоцтваў дзеючага парляманту..." Ясна, што маецца на ўвазе менавіта нелегітымная „палатка" Лукашэнкі. Значыць, *дэ факта* гэтую нелегітымную структуру немка з Эўрапарляманту ўжо прызнае ды патрабуе пашырэньня палаткавых паўнамоцтваў.

Лёгіка далейшых дзеяньняў эўраструктураў, дзе дамінуюць немцы, зразумелая (пра гэта ня раз папярэджвала *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ):* легітымізацыя „палатак", потым легітымізацыя антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі і ўрэшце — легітымізацыя „дабраахвотнага ўзьяднаньня" Беларусі і Расеі. Подлая лёгіка!

*Беларускі Вызвольны Рух* супроцьставіць расейска-нямецкаму пляну аншлюсу ***Беларускую Салідарнасьць*** і абароніць незалежнасьць Бацькаўшчыны.

***(Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. В.Буйвал)***

## СУДОВАЯ РАСПРАВА НАД ЮРЫ БЕЛЕНЬКІМ

*2-4 красавіка* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска разглядалася адміністрацыйная справа спадара ***Юры Беленькага***, выконваючага абавязкі старшыні *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Падтрымаць Яго прыйшлі каля 20 сяброў Партыі. Спадара Беленькага абвінавачвалі ў арганізацыі несанкцыянаванага шэсьця на праспэкце Францішка Скарыны ў Менску ў Дзень Незалежнасьці 25 Сакавіка сёлета. Абвінавачваньні былі заснаваныя на сфальшаваных пратаколах, складзеных супрацоўнікамі міліцыі, і на ілжэсьведчаньнях міліцыянтаў. Нягледзячы на тое, што сп. Беленькі, ягоны адвакат сп. Вера Страмкоўская і сьведкі абароны прадставілі суду неабвержныя доказы невінаватасьці сп. Беленькага і хлусьлівасьці паказаньняў міліцыянтаў (якія, як заўсёды, блыталіся і супярэчылі адзін аднаму, а іхныя пратаколы выглядалі напісанымі пад капірку), суддзя **Вайцяхоўская** вынесла прысуд — 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

Ганебны, несправядлівы прысуд прысутныя беларусы сустрэлі воклічамі „Ганьба!", „Жыве Беларусь!". Яны папярэдзілі суддзю і ілжэсьведкаў, што на іх ляжыць адказнасьць за здзейсьненае парушэньне закону.

Сп. Беленькі заявіў: „З самага пачатку было зразумела, што гэта заказная палітычная справа. Толькі прысутнасьць і падтрымка сумленных людзей не дазволілі суду наладзіць расправу на працягу 1-2 гадзінаў, а прымусілі хаця б вытрымаць працэдуру. Але прысуд быў вядомы ад пачатку".

Адразу з залі суда канвой даставіў сп.Беленькага ў спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік ГУУС Менгарвыканкаму. На рэпрэсіі антынароднага рэжыму сябры *Беларускага Вызвольнага Руху* адкажуць актыўнымі дзеяньнямі па абароне незалежнасьці Беларусі.

***Валеры БУЙВАЛ***

# ПРА АКТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЗДРАДЫ

*12 красавіка 2001 г.* так званая „палата прадстаўнікоў” учыніла дзеяньне супроць інтарэсаў Беларусі. Члены палаты „ратыфікавалі” пагадненьне пра наданьне расейскаму рублю статусу валюты Рэспублікі Беларусь.

Адзіным аргумантам для „ратыфікацыі” было тое, што гэтае пагадненьне ратыфікавала Дзярждума Расейскай Фэдэрацыі.* ***Члены „палаты” непасрэдна парушылі Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, артыкулы 1,8, 136.*** Гэтыя артыкулы ўсталёўваюць наступныя палажэньні:

Арт.136 — „... **Нацыянальны банк ... валодае выключным правам эмісіі грошай**”.

Арт. 8, абзац 3 — „**Не дапускаецца заключэньне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі**”.

Арт. 1, абзац 3 — „**Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасьць і тэрытарыяльную цэласнасьць, канстытуцыйны лад, забясьпечвае законнасьць і правапарадак**”.

Крымінальны Кодэкс, арт. **356**, дакладна кваліфікуе такое дзеяньне: „... оказание иностранному государству помощи в проведении враждебной деятельности против Республики Беларусь путем совершения преступлений против государства по заданию органов или представителей иностранного государства, умышленно совершенное гражданином Республики Беларусь, в ущерб внешней безопасности Республики Беларусь, ее суверенитету, территориальной неприкосновенности, национальной безопасности и обороноспособности (измена государству)), —

*наказывается лишением свободы на срок от семи до пятнадцати лет.”* (Цытуем па-расейску, бо беларускамоўнага тэксту не існуе)

Лукашэнку і палатнікам ня ўдасца прыкрыць свае злачынствы „канстытуцыйным актам”, які яны распрацоўваюць і які, магчыма, паспрабуюць прасунуць праз так званы „усебеларускі сход” 18 траўня 2001г. Робіцца гэта таемна ад грамадзтва, таму адбор удзельнікаў сходу вядзецца пад пільным наглядам рэжыму.

„Ратыфікацыя” высьвятляе сутнасьць намаганьняў расейскай дыпляматыі, антыбеларускага лукашэнкаўскага рэжыму і прамаскоўскай „апазыцыі”. Яны імкнуцца рознымі мэтадамі схіліць заходнія краіны легітымізаваць „палату”. Прызнаньне „палаты” за легітымны парлямант неабходна Маскве толькі для прыданьня выгляду законнасьці далучэньня Беларусі да Расеі. Задачы акупацыі Беларусі расейскі імпэрскі рэжым перавёў у закрыты так званы „саюзны” працэс і вырашае іх праз захоп кіруючых пасадаў у выканаўчай уладзе і сілавых ведамствах, праз зьнішчэньне беларускага бізнэсу і шляхам незаконнай прыватызацыі беларускай уласнасьці.

Здрадніцкія дзеяньні прамаскоўскай групоўкі сустрэнуць рашучы адпор беларускай грамадзкасьці. ***Грамадзяне Беларусі маюць канстытуцыйнае права абараняць незалежнасьць сваёй краіны.***

***(Кіраўніцтва Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

*13 красавіка 2001 г.*

---

* 9-га лютага Бюджэтны камітэт Расейскай Думы адобрыў ратыфікацыю пагадненьня з Лукашэнкам аб увядзеньні ў 2005 годзе адзінай валюты „в российско-белорусском государстве”.

Расейская праўрадавая газэта „Коммерсант-ъ” у сувязі з гэтым напісала наступнае: „Пакольki гэтай адзінай валютай стане расейскі рубель, Беларусь мусіць стаць восьмай фэдэральнай акругай Расеі.

Павелічэньне тэрыторыі дзяржавы заўсёды лічылася справай карыснай. З гэтага пункту гледжаньня далучэньне да Расеі Беларусі — факт станоўчы („отрадный”)... Як толькі расейскі рубель і дэ-факта, і дэ-юрэ стане адзінай валютай, пра Беларусь як пра самастойную дзяржаву можна будзе забыцца”.

*(Коммерсант-ъ, — 2001, 10 лютага (Заўвага рэд.Б.В.)*

# ЗНОЎ ПАДМАНУЛІ ДАВЕРЛІВЫХ БЕЛАРУСАЎ

Збанкрутаваў Белкамбанк. На пачатку сакавіка гомельскія падманутыя ўкладчыкі, пасьля безвыніковых візітаў ва ўладныя структуры, напісаньня скаргаў у цэнтральны апарат Белкамбанку, Нацыянальны банк, розныя праваахоўчыя ворганы, сабраліся на несанкцыянаваны пікет. Укладчыца ***Ніна Фёдарава*** сказала: „Мы сабраліся сёньня, каб паказаць усёй Беларусі: Лукашэнка даваў гарантыі ўсім грамадзянам на захаванасьць укладаў, казаў, што грошы патрэбныя для разьвіцьця дзяржавы. Мы паверылі яму, аддалі ўсе свае зьберажэньні і чакалі, што грошы будуць укладзеныя ў народную гаспадарку Беларусі. Але гэта аказалася ня так. Цяпер нам аб’явілі, што сродкі ўкладзеныя ў маскоўскія структуры, у іх каштоўныя паперы, якія патрапілі ў дэфолт”.

Асабліва абураліся гамельчукі тым, што нават пасьля рашэньня Нацыянальнага банку адносна ліквідацыі Белкамбанку ім ніхто не патлумачыў, якім чынам і калі будуць вернутыя іхныя ўклады.

Намесьнік кіраўніка банкаўскай філіі **Сяргей Андрэенка** праінфармаваў пікетоўшчыкаў, што да вынясеньня ў траўні вэрдыкту Вышэйшым Гаспадарчым судом пра банкруцтва Белкамбанку ніякія выплаты весьціся ня будуць.

Укладчыкі вырашылі зьвярнуцца ў Канстытуцыйны суд, даслаць ліст расейскаму прэзыдэнту Пуціну і спытаць, куды дзелася валюта беларускіх укладчыкаў Белкамбанку.

Чакайце, Пуцін вам адкажа. (Можна яшчэ напісаць Бушу.)

***(Паводле радыё „Свабода”)***

# ВЯЛІКІЯ ЛЮДЗІ

*„Вялікі чалавек здабывае справядлівасьць,*
*малы — выгаду.”*

Канфуцый

Паважаныя людзі — гэта тыя, якія валодаюць аўтарытэтам (у калектыве, у супольнасьці, у грамадзтве, у народзе). Аксіёма, пацьверджаная гісторыяй: *без аўтарытэту не разьвіваецца культура.*

Аўтарытэт асобы не ўтвараецца сам сабой. Павінна адбывацца ўзаемадзеяньне суб’екта і грамадзтва. Пазыцыя і паводзіны чалавека мусяць выклікаць прызнаньне і павагу. Узровень асобы і справы яе могуць пераганяць узровень грамадзтва, якое не ўспрымае, альбо не прызнае тое, што кажа ці стварае такая асоба. Але калі яе ўспрымуць і прызнаюць пазьней іншыя пакаленьні, то для іх яна стане аўтарытэтам.

Вопыт пацьвярджае, што гэтак жа, як шмат якія асобныя людзі, імкнуцца забясьпечыць сабе аўтарытэт у іншых, гэтаксама і грамадзтва для замацаваньня і абароны сваіх дасягненьняў імкнецца мець свае аўтарытэты, падтрымліваць іх, прапагандаваць і нават ствараць.

Дзейнасьць чалавечай супольнасьці, пачынаючы ад самых простых формаў яе існаваньня, ня можа быць абязьлічанай, бо вылучэньне чалавека з прыроды — гэта перш за ўсё, зьяўленьне яго асабовай індывідуальнасьці. Чым вышэйшы ўзровень культуры, тым большая роля і ацэнка асобы.

Хрысьціянства адкрыла чалавецтву каштоўнасьці душы, калі якасьць і ацэнка чалавека перамясьціліся ва ўнутраны сьвет асобы. (Высокія якасьці душы ставіліся вышэй за ўладу і матэрыяльнае багацьце, бо людзі ўспрымалі душу як вечную частку чалавека. Асобу сталі ацэньваць па ўнутраных якасьцях.) У гісторыі духоўнага разьвіцьця чалавека гэта быў найвялікшы прарыў, скачок на верхні

ўзровень. Новая індывідуальнасьць, якой ня ведаў антычны сьвет, стварыла новае грамадзтва і новую культуру Эўропы, дзе асобны чалавек стаў нароўні з грамадзтвам, зрабіўся першаснай каштоўнасьцю гэтага грамадзтва і ўсіх ягоных інстытутаў, ад рэлігіі да дзяржавы.

Калі мы прасочым канцовую мэту духоўнага разьвіцьця чалавека так, як яна тлумачыцца ва ўсіх вышэйшых сусьветных рэлігіях, і асабліва ў Хрысьціянстве, то на духоўным этапе (які дасягаецца праз духоўнае ўдасканаленьне і фізічную сьмерць) супольнасьць увогуле перастае ўтрымліваць вызначальную ролю. Яе як бы і не існуе. Самаіснымі каштоўнасьцямі застаюцца справядлівая індывідуальная душа і яе мэта — злучэньне з Богам.

Але спусьцімся на Зямлю. Відавочны факт, што Хрысьціянства прынесла на Зямлю іншыя дачыненьні да аўтарытарнасьці. Галоўным прынцыпам узаемаадносінаў стаў ўнутраны вольны выбар. Велізарнае значэньне пачалі адыгрываць маральныя аўтарытэты, людзі вялікай адукацыі, ведаў, здольнасьцяў і культуры. Сацыяльная аўтарытарнасьць, якая раней не аспрэчвалася, таксама пачынае ацэньвацца з гледзішча маральных якасьцяў і культурнага ўзроўню. Першасным грамадзкім аўтарытэтам робіцца не герой зь яго разбуральнымі подзьвігамі, як у старым сьвеце, а чалавек-стваральнік, які сваімі думкамі, дзеяньнямі і дасягненьнямі спрыяе грамадзкаму дабру, які ня толькі зьнішчае перашкоды, але, перш за ўсё, стварае і сцьвярджае станоўчую рэальнасьць дзеля лепшага існаваньня і ўдасканальваньня ўсіх.

Менавіта такую асобу найперш стала ўхваляць грамадзтва. Паважаная актыўная асоба стала эфектыўным чыньнікам разьвіцьця культуры. Стваральны ўплыў такой вялікай асобы не абмяжоўваецца пэрыядам яе жыцьця, бо новая нацыянальная супольнасьць, арганізаваная ў нацыянальную дзяржаву, выступае як калектыўная адметная індывідуальнасьць, якая мае свае калектыўныя (нацыянальныя) інтарэсы, галоўныя зь якіх — грамадзка-культурнае разьвіцьцё і падтрыманьне вечнасьці народнага існаваньня.

Вялікая асоба якраз і выяўляла гэтыя інтарэсы. Аўтарытэт асобы ў нацыянальным грамадзтве ёсьць мера і чыньнік грамадзкай культуры, фактар нацыянальнага разьвіцьця. Яго ўплыў, незалежна ад часу, робіцца пастаянным, становіцца гістарычным здабыткам культуры. Ён (гэты ўплыў) можа большаць ці меншаць, але ўжо не мінае, бо пераходзіць у сфэру нацыянальнага духу.

З разьвіцьцём нацыі індывідуальная дзейнасьць у сфэры літаратуры, тэатра і грамадзкіх ідэй мела рашаючае значэньне для сфармаваньня нацыянальнай супольнасьці і стварэньня потым нацыянальных дзяржаваў. Калі не існуе нацыянальнай літаратуры, калі няма вялікіх нацыянальных пісьменьнікаў і паэтаў, то няма і нацыі. Нацыя не ўтвараецца без нацыянальнай літаратуры і тэатру. Нацыянальны тэатр — гэта ўвогуле мастацкая мадэль нацыі ў мініятуры. Але ўся творчасьць нацыянальнага пэрыяду ўжо ня ёсьць безыменнай, калектыўнай, цэхавай, ці вуснай народнай. Гэта ёсьць прафэсійная ўсьвядомленая творчасьць індывідуальнасьцяў, якія імкнуліся ўвасобіць і адлюстраваць агульнае ў канкрэтным, народны лёс у чалавечым вобразе.

Творцы і дзеячы нацыянальнага мастацтва, літаратуры, тэатра, навукі, палітыкі, культуры ёсьць генератарамі ідэй, стваральнікамі нацыянальнай супольнасьці; кожны мае сваё імя і аўтарытэт у пантэоне нацыянальнай культуры. ***Нацыя моцная сваімі вялікімі прадстаўнікамі.*** Уплыў іх абсалютны, каштоўнасьць безумоўная.

Кожнае нацыянальнае грамадзтва адносіцца з асаблівай увагай да сваіх грамадзкіх аўтарытэтаў. Характар дачыненьняў шмат пра што кажа. Тут выяўляецца і ўзровень культуры, і якасьць духу, і ступень салідарнасьці, і пасіянарнасьць, і скрытыя комплексы, і незалежнасьць (ці, наадварот, залежнасьць) думаньня, і нацыянальная сьпеласьць грамадзтва.

* * *

Стабільныя культуры Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі даволі арганічна акамулююць нацыянальныя аўтарытэты ў сфэры свайго грамадзтва. Адносіны да іх разьвіваюцца ў рэчышчы агульнай павагі да чалавека. Павышаны інтэрас можа выклікаць элементы перабольшаньня альбо недаацэнкі, але ў цэлым, носіць аб'ектыўны і здаровы характар. Дачыненьні адэкватныя.

Больш складаныя дачыненьні ў ацэнцы аўтарытэту асобы ў грамадзтвах Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Тут аўтарытэту часта надаецца павышаная хваравітая ўвага і вызначэньне; успрыняцьце можа быць заведама тэндэнцыйным і рэфлексійным, эмацыйныя крытэрыі могуць пераважаць.

Супраць аўтарытэтаў адных асобаў і за аўтарытэты іншых тут нярэдка йдзе змаганьне, часта вельмі аднабокае і далёкае ад рэальнасьці, аб'ектыўнасьць не шануецца, плодзяцца ілюзіі і міфы, на іх, як замкі на пяску, будуюцца цэлыя квазінавуковыя канцэпцыі. На грунце рознасьці ўяўленьняў узьнікаюць дыскусіі і непаразуменьні.

Адной з прычынаў такіх ускладненых дачыненьняў ёсьць тое, што народы Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы ў пэрыяд позьняга сярэднявечча страцілі сваю незалежнасьць, былі падзеленыя паміж чатырма імпэрыямі і толькі ў пачатку XX стагоддзя дамагліся незалежнасьці, а некаторыя неўзабаве зноў апынуліся ў савецкай імпэрыі.

У той складанай сітуацыі шмат якія вядомыя людзі дзейнічалі і тварылі на сумежжы культураў, альбо адначасна ў некалькіх культурах, часам зьмянялі сваю арыентацыю і супрацоўнічалі з акупацыйным рэжымам. Тое ж самае адносіцца да дзеючых сучасьнікаў, калі палітычныя крытэрыі ў грамадзтве пераважваюць над культурнымі і навуковымі.

У цэлым трэба прызнаць, што гэта ёсьць невысокі ўзровень дачыненьняў у ацэнцы вялікіх людзей і выкліканы ён, перш за ўсё, палітычнай няўпэўненасьцю, страхам (часам, неўсьвядомленым) зноў страціць свабоду і незалежнасьць. Адсюль імкненьне самасьцьвердзіцца як найбольш.

У скансалідаваных грамадзтвах Цэнтральна-Усходняй Эўропы адбываецца (часам амаль нябачнае) змаганьне за нацыянальныя аўтарытэты на ўзроўні палітычнай аднабокасьці. Але, трэба сказаць, практычна ніхто ў гэтых грамадзтвах не сумняваецца ў вялікім значэньні аўтарытэту асобы для нацыянальнай сучаснасьці, гісторыі і культуры. Нігілізм, адмаўленьне аўтарытарнасьці культуры тут не прыжываюцца.

Адметны падыход да аўтарытэту як да стваральнага чыньніка разьвіцьця выяўляюць габрэі, для якіх на працягу тысячаў гадоў гісторыі ўтрыманьне аўтарытарнасьці габрэйскай культуры было асноўнай задачай, сродкам духоўнага выжываньня і кансалідацыі, сцьвярджэньня сябе ў не сваім сьвеце.

У дачыненьні да аўтарытэтаў габрэі вольныя ад паталёгіяў Цэнтральна-Усходняй Эўропы. Яны ніколі не бяруць чужога і не выдаюць яго за сваё. Яны ніколі не затоптываюць сваё, зыходзячы з рознасьці палітычных дачыненьняў, бо агульнае (габрэйскае) — вышэй. Тут іншы падыход да аўтарытарнасьці і нацыянальнага самазахаваньня. Лепшую, вядомую, паважаную, здольную, пэрспэктыўную асобу часьцей за ўсё ўзмоцнена прапагандуюць, ёй ствараюць аўтарытэт, ставяць нібы на катурны, яе ўзвышаюць, пра яе часта і шмат гавораць, даюць выдатныя ацэнкі, аўтарытэт і значэньне яе распаўсюджваецца, разьдзімаецца і ўсімі падтрымліваецца. Вядомасьць часам ствараецца ямаль што на пустым месцы, але настолькі энэргічна і пасьлядоўна прапагандуецца, што ніхто ўжо не адважваецца сказаць нешта насуперак. А калі і скажа, то яму ж і горай. Бо хто ж можа сумнявацца ў быццам бы звышгеніяльнасьці ўсімі прызнанай асобы — толькі той, хто ні ў чым не разьбіраецца. (Хаця сумніўца якраз можа разьбірацца найлепш.)

Вельмі дрэннымі здаюцца мне дачыненьні да вялікіх людзей у беларускім грамадзтве. З першага погляду можна падумаць, што наша супольнасьць пакутуе на нейкі сацыяльна-псіхалягічны мазахізм і самаедзтва. Топчацца і не паважаецца менавіта сваё.

Беларускі нацыянальны аўтарытэт — гэта фактычна заўсёды трагічная асоба, якую зьневажаюць, абплёўваюць і здраджваюць нібыта свае беларусы.

Практычна, аднак, нэгатыўныя дачыненьні вызначалі і вызначаюць якраз не беларусы, а калянізатары, акупанты, ворагі беларушчыны. Яны заўсёды былі агрэсіўныя і канцэптуальныя, а беларускае грамадзтва — пасіўнае і, як правіла, канфармісцкае.

Галоўная прычына такога ненармальнага стану ў тым (пра гэта я ўжо пісаў раней), што ў XIX-м стагоддзі была зьнішчана беларуская сацыяльна-культурная эліта, набілітэт, засталіся толькі нізы (у асноўным сяляне і часткова мяшчане). Руская каляніяльная імпэрыя ўвяла тут сваю сацыяльна-дзяржаўную эліту замест зьнішчанай беларускай і беларускія нізы змушаныя былі яе прызнаць як неабходную ўладу, бо іншай альтэрнатывы не існавала.

З гэтага часу пачалася нацыянальная сьлепата, якая ня скончылася па сёньняшні дзень.

Наша грамадзтва з прычыны даўгіх акупацыяў, падзелаў і страты элітаў, слаба скансалідаванае. У ім не хапае разуменьня асноўнага адзінства паміж прыватным, агульнанацыянальным і асабовым. Чалавек сучаснай эўрапейскай цывілізацыі айчынаў успрымае агульнанацыянальныя задачы і прэстыж вялікіх асобаў нацыі гэтак жа, як свой прыватны інтэрас. У пластах беларускага грамадзтва такога неабходнага разуменьня адзінства няма. Яно падзеленае. Задачы нацыі, палітыка, ідэі культуры, дзяржава, улада і прыватныя інтарэсы асобных людзей існуюць у сьведамасьці шмат якіх беларусаў незьвязана, нібы самы па сабе, а дзейнасьць вялікіх аўтарытэтных асобаў народа ацэньваецца як іхняя прыватная справа.

Лёс вялікай нацыянальнай асобы ў гэтакім дэфармаваным нескансалідаваным грамадзтве, як правіла, поўны драматызму. Ворагам беларушчыны лёгка расправіцца з такімі людзьмі, а прапаганда можа вытварыць, што хоча, пры агульнай пасіўнасьці і маўчаньні нацыі. Праца і творчасьць беларускіх адраджэнцаў з гэтае прычыны патрабавалі выключнай самаадданасьці.

Жыцьці вялікіх беларусаў ужо больш-менш апісаныя, больш-менш вядомыя. Менш адчыненымі засталіся грамадзкія абставіны трагедыі, якія якраз высьвятляюць яе зьмест. Гэта, перш за ўсё, абыякавасьць у грамадзтве да лёсу сваіх прадстаўнікоў.

Калізія паміж ахвярнасьцю змагарнай асобы і здрадай ёй (як непрыняцьцем асобы) адлюстраваная ў найвялікшай паэтычнай драме ***Янкі Купалы*** „***Сон на Кургане***". Нагадаю схему сюжэта. Змагара Сама, які змагаўся за шчасьце і волю беларускага народа, беларусы (у дадзеным выпадку, сяляне) услужліва аддаюць у рукі царскіх сатрапаў. Схема для Беларусі тыповая і знаёмая, пачынаючы ад здачы інсургентаў ***Кастуся Каліноўскага*** царскім уладам да даносчыкаў НКВД і прыхільнікаў Лукашэнкі.

Гэтай жа трагічнай калізіі прысьвяціў сваю выдатную паэтычную драму „***Пакрыўджаныя" Леапольд Родзевіч***. Маналёг змагара за свабоду ад прыгону — старога скульптара Пііпа, адрынутага ў канцы драмы роднай дачкой, — ёсьць, бадай, адзін з самых прачулых і трагічных у беларускай паэтычнай драматургіі.

Беларуская рэчаіснасьць адэкватная такой літаратуры і ня менш выразная.

***Міхась Зарэцкі***, як і сотні беларускіх інтэлігентаў, пісьменьнікаў і паэтаў, быў зьнішчаны ў 1930-х гадах рускім НКВД. Сьледчыя-чэкісты шукалі рукапіс яго рамана „***Крывічы***", спачатку — каб прад'явіць уліку, а потым, пасьля прысуду, каб зьнішчыць раман. Не знайшлі. А рукапіс быў у вёсцы, і сяляне-дзядзькі, аматары махоркі, скарысталі гэты рукапіс — на ... самакруткі. Раман скурылі. Рэшта зьнікла ў НКВД.

Тут справа ня толькі ў адсталасьці і неадукаванасьці. Нешанаваньне свайго, выхаванае ў сялянскай сьведамасьці чужынцамі, прыводзіць да заганнай ацэначнай формулы: „Няма прарока ў сваёй айчыне". Які ўжо там аўтарытэт, якая павага!

***Васіля Быкава*** ведае ўвесь сьвет. На Беларусі яго называюць сумленьнем нацыі. Гэта вялікі пісьменьнік, вялікі чалавек. Сіла ягонага маральнага аўтарытэту такая вялікая, што той чалавек, той чыноўнік, той дзяржаўны дзеяч, які пачаў бы яго зьневажаць ды паліваць брудам ягонае імя, павінен выклікаць усеагульнае абурэньне і шырокае асуджэньне брыдкіх паводзінаў, бо Быкаў — гэта ўжо ня проста вялікі пісьменьнік — ён вялікі гонар і каштоўнасьць Беларускай нацыі.

Аж не. У Беларусі, аказваецца, можна зьневажаць і Быкава. І гэта абыходзіцца, сходзіць з рук. І ворагі беларушчыны пра тое ведаюць.

Калі прааналізаваць жыцьцё беларускіх адраджэнцаў — вялікіх людзей XX-га стагоддзя, уражвае пастаянства іхных ілюзіяў у дачыненьні да беларускага грамадзтва і да Расеі. Хоць, здавалася б, хто лепш за іх павінен бы быў усё ведаць.

У канцы 60-х у размове з Паўлінай Мядзёлкай я даведаўся, што калі ў сярэдзіне 20-х на Беларусь вярнуліся з эміграцыі шмат якія беларускія нацыянальныя дзеячы і атрымалі навуковыя ды дзяржаўныя пасады ў БССР, яны неяк сабраліся разам і тады, здаецца, Язэп Лёсік сказаў: „Ну, цяпер ужо беларускай справе ніхто і нішто не перашкодзіць".

Праз нейкі час усе яны былі зьнішчаныя НКВД.

У 1922 годзе Аляксандар Цьвікевіч, выступаючы на пахаваньні Алеся Бурбіса і расказаўшы пра ягонае цяжкае жыцьцё, пакуты, турмы і перасьледы, зазначыў, што ён быў беларусам-адраджэнцам, а жыцьцё адраджэнца — гэта ахвярнасьць і служэньне Беларусі. Яно немагчымае без пакутаў.

* * *

Падагульняючы думкі пра сітуацыю, якая склалася на Беларусі ў дачыненьні да аўтарытэтных людзей нацыі і разумеючы, чаму так ёсьць, можна зрабіць дзьве галоўныя высновы, якімі, па маіх назіраньнях, кіраваліся вялікія адраджэнцы, такога ўзроўню, як ***Ларыса Геніюш*** і *ксёндз* ***Адам Станкевіч***.

Па-першае. Каб запабегчы расчараваньням, трэба ня мець ілюзіяў. Беларускі адраджэнец павінен адносіцца да сваёй дзейнасьці (у якой бы галіне яна ні адбывалася) як да місіі, як да прызначэньня, памятаючы, што народ, людзі ёсьць такія, якія яны ёсьць, што іншых людзей няма і трэба дапамагаць ім вярнуць свой нацыянальны гонар і стаць вольнымі беларусамі, не чакаючы ад іх ні ўдзячнасьці, ні ўзнагароды. Адраджэнец мусіць узвышацца над абставінамі і не кідацца ў пэсымізм.

З іншага боку, кожны беларус, грамадзянін Беларусі, мусіў бы сабе ўсьвядоміць, што ***найпершае багацьце нацыі — гэта яе разумныя, таленавітыя, здольныя, адукаваныя вялікія асобы***. Ім павінна быць найпершая павага, шанаваньне і абарона.

Другая выснова. У абставінах грамадзкага асьляпленьня ***нельга абвінавачваць усю нацыю***, крыўдзіцца на народ і, тым больш, зьневажаць яго (як часам цяпер бывае). Гэта было б цалкам няправільна і абсалютна беспэрспэктыўна.

Калі я азіраюся на XX-е стагоддзе, мяне ўражвае маральная веліч беларускіх адраджэнцаў. Гэта людзі высокай пробы. Іхняя дарога, справы, дзейнасьць — ёсьць шлях дасканалых.

Кожны адраджэнец адчувае сябе народам. Кожны мог бы сказаць: ***народ — гэта я***. І гэта праўда. Гэта правільнае, нармальнае адчуваньне. Гэтак павінен бы думаць кожны чалавек у дасканалым грамадзтве.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*22 сакавіка 2001г., Нью-Ёрк*

# ПАЧУЎ І ЗРАЗУМЕЎ

*(Вытрымкі зь ліста Міхаіла Шапавалава з Дзьвінску. Латвія)*

„У нас ёсьць магчымасьць чуць беларускае радыё. Я ўражаны. Першая перадача, што я пачуў, — „Размова па сутнасьці".

Дзіўна, як у Беларускай дзяржаве за грошы беларусаў дазваляюць рабіць антыбеларускую перадачу. У ёй жа адкрыта распальваецца варожасьць, нянавісьць да беларусаў. Тых, хто змагаецца за

адраджэньне нацыянальнай сьвядомасьці і за незалежнасьць Беларусі, называюць нацыяналістамі і ворагамі. Паслухаўшы некалькі такіх перадач, я ўпэўніўся: ідзе бесперашкодная і ўпэўненая акупацыя Беларусі. Краіна ў небясьпецы!..

Трэба пастаянна папярэджваць пра небясьпеку. Беларусам ў сябе на радзіме непрыстойна прыніжацца і прасіць у розных прыхадняў дазволу, каб адзначыць Дзень Незалежнасьці сваёй Радзімы. Трэба не прасіць і ня кланяцца, а выганяць іх у каршэнь. Усіх ворагаў Беларусі трэба браць на ўлік і, паводле ступені іх злачынстваў перад беларускай нацыяй, уручаць ім чамаданы альбо позвы ў суд. Ня варта цешыць сябе ілюзіямі і спадзяваньнямі на лукашэнкаўскія восеньскія выбары.”

***(З радыё „Свабода”)***

## ГЭБІЗМ

Штатны кагэбовец **Сяргей Якімук** за ўвагу да працы па аднаўленьні Крыжа Эўфрасіньні Полацкай ўзнагароджаны высокай царкоўнай узнагародай, якая была ўручана яму 28 красавіка ў г.Бярозе мітрапалітам Менскім і Слуцкім Філярэтам, калі той прыехаў сюды па сваіх „царкоўных” справах.

Царкоўная ўзнагарода для супрацоўніка КГБ можа выклікаць у недасьведчаных людзей, як мінімум, зьдзіўленьне.

Падзею камэнтуе прадстаўнік аўтаномнай рускай праваслаўнай царквы айцец ***Міхаіл Ардаў*** з Масквы: „Што тычыцца ўзнагароджаньня супрацоўнікаў КГБ іерархамі Патрыярхіі, дык гэта цалкам натуральны працэс, бо на працягу ўсёй гісторыі саветаў Маскоўская патрыярхія была пад кантролем і марыянэткай у руках КГБ.

Мы ведаем, былі ў нас гэтыя скандальныя публікацыі пра тое, што высокапастаўленыя іерархі, многія сьвятары служылі агентамі КГБ. У прыватнасьці, як агент КГБ быў выяўлены мітрапаліт Менскі Філярэт, які меў там агентурную мянушку „Астроўскі”, а гэтак званы „сьвяцейшы патрыярх Алексій” меў там мянушку „Драздоў”.

Мала таго, у нас у Расеі адбыліся яшчэ больш цікавыя з гэтага пункту погляду падзеі. Наш прэзыдэнт — вядомы кадравы афіцэр КГБ — уручыў дзяржаўныя ордэны 30-ці сьвятарам. Такім чынам, гэта — узаемныя абмены і ўзаемнае прызнаньне заслугаў супрацоўнікаў аднаго ведамства. Тут няма нічога дзіўнага.”

***(Паводле радыё „Свабода”. К. Бандарук)***

## ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

### *СТУДЗЕНЬ (2001 год)*

*З 1 па 5 студзеня* ў Беларусі прайшоў страйк прыватных прадпрымальнікаў. У акцыі прынялі ўдзел звыш 150 тысячаў чалавек. Патрабаваньні засталіся ранейшымі: адмена пастановы Дзяржаўнага мытнага камітэту „Аб мытным афармленьні тавараў” у частцы, што тычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, і прыняцьцё зьменаў у дэкрэты Лукашэнкі аб канфіскацыі тавараў у прадпрымальнікаў. Улады ніяк не адрэагавалі на страйк, а таму страйкам заявіў, што пачынае падрыхтоўку да новага (цяпер ужо бестэрміновага) страйку прадпрымальнікаў.

*4 студзеня.* У Чыгуначным судзе *Віцебска* суддзя **Сьвятлана Туфан** вынесла прысуды актывістам АГП, якія 10 сьнежня ладзілі несанкцыянаваны пікет: ***А. Залескай*** *— штраф у 150 мінімальных заробкаў (мін.з.);* ***С. Васенку*** *— 150 мін.з.;* ***Дз. Мускаму*** *— папярэджаньне;* ***А. Захараву*** *папярэджаньне.*

*8 студзеня, Віцебск.* Віцебскія змагары напісалі зварот да праваабарончых арганізацыяў на Беларусі. У звароце напісана: „*У апошні час супраць найбольш актыўных сяброў нашае арганізацыі з боку віцебскіх уладаў, і асабліва праваахоўчых ворганаў, пачаўся страшэнны ўціск. Асабліва ён узмацніўся пасьля поўнага правалу выбараў 15 кастрычніка 2000г., калі ні ў адной з чатырох выбарчых акругаў у так званую „палату” ў Віцебску ня быў абраны ніводны дэпутат.*

*За арганізацыю мерапрыемстваў па няўдзелу грамадзянаў г.Віцебска ў выбарчым фарсе* ***Ю. Карпаў****,* ***У. Плешчанка****,* ***Б. Хамайда****,* ***З. Піменаў*** *пакараныя штрафам на сотні тысячаў рублёў кожны.*

*Першамайскі РАУС Віцебска спрабуе ўзбудзіць супраць З.Піменава крымінальную справу па арт.201 ч.3 КК Беларусі („злоснае хуліганства”), што пагражае яму турэмным зьняволеньнем да 7 гадоў.*

*Чаго хочуць ад З.Піменава ў РАУСе пацьвярджае выпадак 26 сьнежня 2000г., калі туды быў дастаўлены старшыня Віцебскай гарадзкой арганізацыі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Ул. Плешчанка****. Ён памылкава быў прыняты за З.Піменава.*

*Супрацоўнікі Першамайскага РАУС пачалі яго (нібыта Піменава) абражаць „последним отморозком”, якому адсюль ніколі ня выбрацца. Цяпер, маўляў, яму прыдзецца заплаціць за ўсё: і за вывешваньне на сваім балконе Бел-Чырвона-Белага Сьцягу, і за хаджэньне зь ім па горадзе, і за заклікі да жыхароў мікраёну не хадзіць на выбары.*

*У пачатку сьнежня 2000 г. З.Піменаў выехаў за мяжу Беларусі на заробкі, а старэйшы сьледчы* ***А.Рашчынскі*** *шле З. Піменаву позвы ў міліцыю і пагражае таго пасадзіць у турму.*

*Улада хоча адпомсьціць за свае няўдачы ў час апошніх выбараў і ў якасьці сваёй ахвяры выбрала З.Піменава, старшыню Чкалаўскай суполкі Партыі БНФ у Віцебску.*

*Мы заклікаем праваабарончыя арганізацыі на Беларусі, БГК, прадстаўнікоў міжнародных арганізацыяў, якія акрэдытаваныя на Беларусі, не дазволіць здзейсьніць гвалт над Зьміцерам Піменавым.”*

*(Старшыня Віцебскай гарадзкой арганізацыі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Плешчанка****)*

*9 студзеня* Міжнародная Ліга правоў чалавека даслала ліст А.Лукашэнку, дзе выклала сур’ёзную заклапочанасьць фактамі ўціску ГА ПЦ „Вясна”. Выканаўчы дырэктар Лігі ***Кэтрын Фіцпатрык*** сцьвярджае, што „папярэджадні Мін’юсту аказваюцца часткай кампаніі перасьледу ў адносінах да гэтай і іншых праваабарончых групаў Беларусі, якія адкрыта і бескампрамісна адстойваюць правы чалавека”. Спадарыня Фіцпатрык падкрэсьліла, што „Беларусь ня зможа разглядацца як частка Эўрапейскай супольнасьці, пакуль ня прыме належныя захады па захаваньні і падтрымцы асноўных свабодаў”, і заклікае беларускія ўлады спыніць перасьлед „Вясны” ды іншых праваабарончых арганізацыяў.

*10 студзеня* паэт ***Алесь Разанаў*** выехаў ў Нямеччыну па запрашэньні Міжнароднага парляманту пісьменьнікаў. Ён заявіў журналістам, што паэты вымушаныя зьязджаць надоўга, калі застаюцца бяз сродкаў да існаваньня, калі напісаныя кнігі гадамі ляжаць у выдавецтве. За межамі Беларусі цяпер жывуць некалькі беларускіх літаратараў з гучнымі імёнамі: ***Васіль Быкаў*** у Нямеччыне, ***Уладзімер Някляеў*** у Фінляндыі, ***Сьвятлана Алексіевіч*** у Італіі.

*12 студзеня* газэта „Наша свабода” надрукавала прыватнае „лекарскае заключэньне” аб стане псіхічнага здароўя А.Лукашэнкі. Лекар-псіхатэрапэўт ***З.Шчыгельскі*** паставіў дыягназ: „памяркоўная мазаічная псіхапатыя з перавагаю рысаў параноідальнага і дысацыяльнага растройства асобы”. Чалавека з такім дыягназам нельга браць на службу ў войска нават у мірны час. 15 студзеня стала вядома, што пракуратура зацікавілася гэтай публікацыяй.

*13-14 студзеня. Лошыца, Менск.* Сьпілавалі *Крыж памяці*, пастаўлены ў 1993 годзе *Беларускім Народным Фронтам* каля *Лошыцкіх яроў*, дзе расстраляныя і пахаваныя ахвяры сталінскіх рэпрэсіяў. Невядомыя пакінулі подпіс „РНЕ”. Ужо праз два дні крыж аднавілі рабочыя-дарожнікі, што працуюць непадалёк. Зрабілі тое самы, не чакаючы падказкі.

У Лошыцы пахаваныя да 10 тысячаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Тут, пад аўтамабільнымі гаражамі, пакояцца рэшткі лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, рэпрэсаваных НКВД. Гэта месца не ахоўваецца, але яно добра дагледжанае. Тут растуць кветкі, ляжаць вянкі. Штогод на *Дзяды* да Крыжа прыходзяць людзі. Крыж прастаяў 8 гадоў. Ніхто яго не чапаў. Тое, што цяпер здарылася і што гэты вандалізм мае адносіны да РНЕ, на думку лідэра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ* ***Юры Беленькага***, сьведчыць пра небясьпеку распаўсюджваньня ў Беларусі расейскай прафашысцкай ідэалёгіі. „Невыпадкова сёньняшняе спрыяньне палітыкі Лукашэнкі і ягоных маскоўскіх гаспадароў вось гэтаму накірунку. Мы бачым, як яно адбываецца. Сябры *Партыі БНФ* былі сьведкамі, калі міліцыя спрыяла аднаму з РНЕ, які паказваў сваю агрэсіўнасьць у дачыненьні да нашых жанчын, якія стаялі ў пікеце. Мы бачым, хто прышоў да ўлады ў Беларусі: якраз тыя людзі... Крайняя шавіністычная расейская плынь.. „ — адзначыў Ю. Беленькі.

У Ленінскім РАУС Менску паведамілі, што пакуль рашэньня аб ўзбуджэньні крымінальнай справы па факту вандалізму не прынятае.

*15 студзеня. У Слуцку* была апісаная маёмасьць ***Аляксея Катлярова*** — вайсковага пэнсіянера, сябра БГК. Судовыя выканаўцы **Любоў Сілачова** і **Тамара Лапіцкая** ў суправаджэньні панятых зьявіліся на кватэру сп. Катлярова і апісалі маёмасьць. (Раней А.Катлярова судзілі па адміністрацыйнай справе і прысудзілі штраф 150 мінімальных заробкаў (гэта каля 500 даляраў ЗША).

*15 студзеня ў Берасьці* суд прысудзіў удзельнікам акцыі пратэсту 10 сьнежня (Дзень Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека) штрафы: ***Яўген Балясін*** — 200 мінімальных заробкаў (мін.з.); ***Сяргей Бахун*** — 200 мін.з.; ***Уладзімер Вялічкін*** — 20 мін.з.; ***Кірыла Данько*** — 20 мін.з.; ***Алег Дыдышка*** — 20 мін.з.

*16 студзеня* на цэнтральную плошчу Барысава выйшлі сябры БСДГ (Народная Грамада) і Маладой Грамады ***Алесь Абрамовіч, Алеся Ясюк, Надзея Грачуха, Зьміцер Кузьняцоў*** і ***Міхаіл Кузьняцоў*** з патрабаваньнямі неадкладнай медыцынскай экспэртызы стану псіхічнага здароўя **Аляксандра Лукашэнкі**. Несанкцыянаваны пікет доўжыўся амаль паўгадзіны. Усе ўдзельнікі акцыі былі затрыманыя і дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі, дзе на іх склалі пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня па арт. 167.1 ч.2 КаАП.

*19 студзеня ў пасёлку Каменная горка на Меншчыне* ў ба́ры каля дарогі п’яныя супрацоўнікі Камітэту па арганізаванай злачыннасьці і карупцыі пры МУС маёр **Собаль Н.А**. і капітан **Ашмянскі Д.А**. у адказ на заўвагу гаспадара бару ***А.Ю. Талсталуцкага*** (каб не прыставалі да жанчын з абслугі бару) накінуліся на сп.Талсталуцкага. „Барацьбіты з карупцыяй” зьбілі яго і дзесяць разоў стрэлілі над вухам з табельнай зброі. Пры гэтым прысутнічалі жонка і дзеці пацярпелага. На наступны дзень, праспаўшыся, міліцыянты падаслалі да Талсталуцкага бандытаў са сваёй кліентуры. Тыя пагражалі пацярпеламу і патрабавалі забраць заяву з пракуратуры. (Другую частку „акцыі” арганізавалі кіраўнікі згаданага камітэту, палкоўнікі.)

*20 студзеня* ля „сіняга дому” ў Віцебску ў чарговы раз быў затрыманы ***Ўладзімер Плешчанка***. Ён распаўсюджваў артыкул *Зянона Пазьняка „Асьцерагайцеся чарцей з табакеркі”* і наваголднюю казку *„Пра зьмея Луку, пра чыстую руку і мех панцаку”*. Падыйшла міліцыя. Сталі вывучаць распаўсюджваемую літаратуру. Сабралася шмат людзей. З „дапамогай” міліцыі, якая прыцягнула ўвагу да падзеі, літаратура была хутка разабраная віцяблянамі.

*21 студзеня ў Воршы* быў затрыманы старшыня Свабоднага прафсаюзу прадпрымальнікаў Воршы і раёну ***Аляксандар Сталяроў*** падчас распаўсюджваньня інфармацыйнага бюлетэня *„За перамены”*. Затрыманьне праводзілі двое міліцыянтаў і адзін у цывільным. А.Сталярова даставілі ў ГАУС, дзе дапытвалі каля гадзіны і адпусьцілі. На думку А.Сталярова, такім чынам улады спрабуюць аказаць ціск на прадпрымальнікаў, якія ўдзельнічалі ў нядаўнім страйку.

*22 студзеня.* За арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця страйкуючых рабочых шклозаводу Барысава 21 лістапада летась Барысаўскі гарадзкі суд прысудзіў ***Алесю Абрамовічу*** штраф у 150 мін.заробкаў (гэта 450 даляраў ЗША). Суддзя **А**. **Болатаў**.

*30 студзеня ў Віцебску* на чыгуначным вакзале быў затрыманы ***Уладзімер Плешчанка***. Супрацоўнікі РАУС забралі ў яго частку друкаваных матэрыялаў. Тэкст казкі *„Пра зьмея Луку, пра чыстую руку і мех панцаку”,* якую адабралі ў сп.Плешчанкі, пракуратура Чыгуначнага раёну накіравала на экспэртызу. Адмыслоўцы, маўляў, мусяць зрабіць выснову, ці ўтрымлівае казка абразу асобы Лукашэнкі, або яшчэ якую крамолу. Калі „ўтрымлівае”, то спадар Плешчанка можа быць прыцягнуты да адказнасьці, нават крымінальнай, як распаўсюджвальнік літаратуры „шкоднага” зьместу.

*Студзень.* Рабочыя Магілёўскага аўтамабільнага заводу (МаАЗ), якія 28 сьнежня (мінулага году) перакрылі дарогу з патрабаваньнем выплаціць заработную плату за лістапад, падпалі пад рэпрэсіі з боку ўладаў і ўласнай адміністрацыі.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-цэнтры Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ), кіраўніцтва заводу актыўна займалася пошукам удзельнікаў акцыі. Па загадзе адміністрацыі былі вызваленыя ад працы работніцы табельнага бюро МаАЗ, якім паказалі міліцэйскую відэаздымку падзей 28 сьнежня. Жанчыны павінны былі апазнаваць рабочых, зьнятых на плёнцы. Тых, хто быў апазнаны, выклікалі ў заводакіраўніцтва, дзе іх чакаў супрацоўнік міліцыі. Складаліся пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні. Такім чынам да адказнасьці былі прыцягнутыя некалькі дзясяткаў чалавек.



*Малітва пад Лошыцкім Крыжам. 2000 г.*

Кіраўніцтва СПБ мае намер адстойваць (у тым ліку і праз суды) правы рабочых, якія падпадаюць пад рэпрэсіі за законнае патрабаваньне — выплаціць зробленыя грошы.

*Студзень.* Як паведаміла газэта *„Пагоня”*, 8 сьнежня мінулага году па-варварску быў зьнішчаны крыж ля *Парэцкай царквы, што на Слонімшчыне.* Помнік усталявалі на *Дзяды* слонімскія краёўцы ў


*Шэсьце да Лошыцкага Крыжа на Дзяды. 2000 г.*

гонар беларускага паўстанца ***Міхала Валовіча*** і ягоных паплечнікаў. *(Пагоня, №42, 9 лістапада 2000 г.)*

Пяцімэтровы шасьціканцовы крыж быў асьвечаны ўніяцкім сьвятаром, што не спадабалася праваслаўным сьвятарам рускай праваслаўнай царквы і мясцовым уладам. Менавіта па іхнай ініцыятыве крыж быў зьнішчаны.

*30 студзеня.* Намесьнік старшыні Вярхоўнага Савета 13-га скліканьня ***Генадзь Цярэня*** 30 студзеня ў 0 гадзінаў 40 хвілінаў быў зьняты зь цягніка і затрыманы беларускімі мытнікамі на чыгуначнай станцыі Гудагай (Горадзенская вобласьць). Супрацоўнікі мытні правялі яго асабісты дагляд, канфіскавалі відэакамэру Sony і матэрыялы сэмінара „Негвалтоўная барацьба за дэмакратыю і дэмакратычныя працэсы ў Беларусі”, які прайшоў у Вільні пад эгідай Літоўскай асацыяцыі правоў чалавека.

Паводле Генадзя Цярэні, пратаколы аб адміністрацыйным мытным парушэньні і аб канфіскацыі рэчаў і дакумантаў не адпавядаюць сапраўднасьці, утрымліваюць хлусьлівыя абвінавачваньні.

*Студзень.* У Менску на частаце FM-дыяпазону пачала вяшчаньне расейская радыёстанцыя „Рускае радыё”. Праект ажыцьцёўлены пры ўдзеле беларускага „Радыё Рокс” і Рэспубліканскага радыёперадаючага цэнтра. „Рускае радыё”стала дзевятай рускамоўнай радыёстанцыяй, якая вяшчае ў беларускім FM-дыяпазоне. Беларускага радыё тут няма.

*31 студзеня* супрацоўнік Упраўленьня Камітэту па арганізаванай злачыннасьці і карупцыі па Берасьцейскай вобласьці пры МУС капітан **Кылін А.А**. у нецьвярозым стане вёў машыну і сутыкнуўся з маршрутным аўтобусам, перапоўненым пасажырамі. Яго спрабавалі затрымаць грамадзяне і супрацоўнікі ДАІ. Кылін выхапіў табельны пісталет і, пагражаючы натоўпу і міліцыянтам, страляў у паветра.

Вось гэта камітэт! Трымці, карупцыя!..

*31 студзеня* каля свайго дому трыма невядомымі быў жорстка зьбіты супрацоўнік грамадзкага аб’яднаньня „Прававая дапамога насельніцтву” ***Алег Случак***. Злачынцы былі затрыманыя міліцыяй, але крымінальную справу не ўзбудзілі, спасылаючыся на тое, што злачынцы ўсё адмаўлялі. А у міліцыянтаў, маўляў, доказаў супраць іх было мала. А.Случак у цяжкім стане дастаўлены ў шпіталь.

*Студзень.* У 2000 г. прыкладна 45% сем’яў Магілёўшчыны мелі даходы ніжэй за бюджэт пражытковага мінімуму. У параўнаньні з 1999 г. гэты паказчык павялічыўся на 8%. У асноўным, елі хлеб.

*Студзень. У Горадні* судовымі выканаўцамі апісаная маёмасьць бацькоў ***Сьвятланы Нех*** — намесьніцы старшыні гарадзкой арганізацыі Маладой Грамады. У лістападзе яна была аштрафаваная Ленінскім судом Горадні на 150 мін. заробкаў за ўдзел у акцыі „Моладзь за перамены”. Паколькі дзяўчына ня мае ўласнай маёмасьці, улады вырашылі пакараць яе бацькоў. *(Гэта грубае парушэньне права і закону.)*

*Студзень. Ворша.* Да штрафу памерам па 150 мін. заробкаў (гэта каля 440 даляраў ЗША) асудзіў Аршанскі раённы суд актывістаў Свабоднага прафсаюзу Беларускага ***Віктара Андрэева*** ды ***Юры Санько***. Суд расцаніў звычайную сустрэчу з аршанскімі выбаршчыкамі як несанкцыянаваны пікет.

■ У Лунінецкім раёне апошнім часам расьце колькасьць захворваньняў на кішэчныя інфэкцыі і гепатыт А. Прычына — забруджаньне пітной вады. 70% пробаў калодзежнай вады не адпавядала нормам. Людзі ўсё часьцей хварэюць на педыкулёз — удвая болей, чым у сярэднім па вобласьці. З 50 лазьняў ў раёне функцыянуюць менш паловы.

■ Навуковы патэнцыял Беларусі вычэрпваецца. сёньня ў нас толькі 32000 вучоных-дасьледчыкаў. Гэта значыць, што на 10 тысячаў беларускага насельніцтва іх прыпадае ўсяго 19 чалавек. Паводле разьлікаў Міжнароднай арганізацыі эканамічнага супольніцтва, нармальная колькасьць дасьледчыкаў для Беларусі — 35000.

## *ЛЮТЫ*

*Люты. Крычаў.* На пачатку лютага супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі кур’ераў двух выданьняў і канфіскавалі агулам больш 300 асобнікаў газэтаў. Абедзьве газэты не зарэгістраваныя і выходзяць накладам па 299 асобнікаў. Канфіскаваныя наклады рэдакцыям не вярнулі. У дачыненьні да рэдактараў узбуджаная і перададзеная ў суд крымінальная справа. 2 лютага суддзя **Уладзімер Жандараў** (вельмі адпаведнае прозьвішча) палічыў дзьве газэты за адно выданьне і прыняў пастанову аб накладаньні штрафу па 50 мін. заробкаў на галоўнага рэдактара газэты „Вольны горад” ***Сяргея Няроўнага*** і на рэдактара „Новага Вольнага гораду” ***Мікалая Матроненку***.

У трэцяга жыхара Крычава, сузаснавальніка „Вольнага гораду” ***Вадзіма Стэфаненкі*** наклад не канфіскавалі. Але калі ён прышоў у міліцыю з рашэньнем суду аб тым, што ягоны наклад газэты не падлягае канфіскацыі, каб забраць газэту, там адмовіліся яе аддаць.

*Люты. Крычаў.* Крычаўскі райвыканкам папрасіў дапамогі ў кіраўніцтва Смаленскай вобласьці „прыняць захады па спыненьні друкаваньня беларускай газэты „Вольны горад” у друкарні г.Смаленска”. Просьба аргумэнтуецца тым, што „Вольны горад” „усяляк аблівае брудам саюз Беларусі і Расеі, ачарняе братнюю інтэграцыю славянскіх народаў”. Зварот у Смаленск падпісала намесьніца старшыні Крычаўскага райвыканкама **Зінаіда Скачкова** (дата: 12.02.2001).

*У пачатку лютага ў Мёры* прыехала перасоўная выстава „2000 год Хрысьціянству. Беларусь праваслаўная”. Выканкам тэрмінова сабраў дырэктараў усіх дзіцячых навучальных установаў і загадаў



*Пад сьцягам.*

забясьпечыць стоадсоткавае наведаньне выставы вучнямі тутэйшых школаў.

Далучэньне да праваслаўных культурных каштоўнасьцяў адбываецца па графіку, незалежна ад жаданьня вучняў і іх канфэсійнай прыналежнасьці. Настаўнік, чыя лекцыя прыпадае на прызначаны час, павінен весьці дзяцей на выставу.

*Люты.* Супраць чатырох актывістаў арганізацыі „Зубр" узбуджаныя крымінальныя справы за надпісы на сьценах дамоў. Менскія студэнты ***Анатоль Елізар***, ***Сяргей Коктыш***, ***Аляксандар Ермакоў*** былі затрыманыя 26 студзеня каля будынку Партызанскага райвыканкаму сталіцы. Праз некалькі дзён па гэтай жа справе абвінавацілі студэнта інстытуту сучасных ведаў ***Аляксея Шыдлоўскага***.

*Люты.* Бестэрміновы страйк, аб'яўлены салігорскімі прыватнымі прадпрымальнікамі 1 лютага, захлынуўся менш як за тыдзень. 7 лютага ўжо звыш за 70% з паўтары тысячы ўдзельнікаў страйку выйшлі гандляваць. Падставаю для рашэньня Незалежнага прафсаюзу прадпрымальнікаў аб страйку стаўся велізарны штраф (каля 800 даляраў), накладзены на прадпрымальніцу ***В.Фралову*** Слуцкім міжраённым камітэтам дзяржкантролю.

*Люты.* Па пунктах продажу прэсы ў Менску разышоўся цікавы дакумант, які варта пераказаць цалкам і на мове арыгіналу: „Уважаемые киоскеры, работники магазинов! Вы несете полную ответственность за расположение газет на прилавке. Нужно раскладывать на видном месте так: Советская Белоруссия, Республика, Звязда, Народная газета, Знамя юности, Чырвоная Зьмена, Вечерний Минск и т.д." *(Директор предприятия* **Л.К.Шабловская***)*

*Люты.* Праўленьне гарадзенскага аддзяленьня Беларускага саюзу мастакоў большасьцю галасоў прыняло рашэньне забараніць заплянаваную на 23 сакавіка мастацкую выставу „*Дзяды*" мясцовага скульптара ***Юры Мацко***. Забарону ініцыявала дырэктар гарадзенскай выставачнай залы Саюзу мастакоў **Ірына Працко**. Абгрунтавала гэта тым, што „экспазіцыя пагражае грамадзкаму парадку". Маўляў, гэта ёсьць прапаганда палітычных ідэяў. „Гэта будзе нацыяналістычны шабаш, на выставе могуць пабіць шыбы, усе акцыі „апазіцыі" заўсёды пераўтвараюцца ў скандал", — заявіла гарадзенская статс-дама.

*5 лютага* за расклейку налепак, прысьвечаных акцыі з нагоды Дня сьвятога Валянціна былі затрыманыя ***Павал Красоўскі*** і ***Андрусь Рагачэўскі***. Сяржант міліцыі **М.Сабалеўскі** спаслаўся на загад затрымліваць усіх, хто расклейвае ўлёткі альбо налепкі, асабліва падлеткаў. Зь яговых словаў, гэта зьвязана з выбарчай прэзыдэнцкай кампаніяй, што нібыта ўжо распачалася. Перапісаўшы дадзеныя пашпартоў ды захапіўшы сабе адну налепку, міліцыянт папярэдзіў, што па маладафронтаўцаў могуць прыехаць, і адпусьціў іх.

*6 лютага, Менск.* Менгарвыканкам зноў адмовіў бацькам загінуўшых на Нямізе дзяцей у правядзеньні пікету, мэта якога — прыцягненьне ўвагі грамадзкасьці да пытаньня ўшанаваньня памяці бязьвінна загінуўшых. Пікет плянавалася правесьці 10 лютага ў 200 мэтрах ад пераходу станцыі мэтро „Няміга". На папярэднім пікеце, які адбыўся 4 лістапада 2000 г., бацькі сабралі каля двух тысячаў подпісаў мінчукоў у падтрымку ідэі стварэньня капліцы на месцы, дзе 30 траўня 1999 г. загінулі 53 чалавекі.

*7 лютага* ў пракуратуру Барысава былі выкліканыя ***Алеся Ясюк*** і ***Алесь Абрамовіч*** у якасьці падазраваемых па крымінальнай справе па арт. 368 новага Крымінальнага кодэксу („Зьнявага Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь"), згодна зь якім, публічная зьнявага прэзыдэнта караецца штрафам ці папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, ці арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў, ці абмежаваньнем волі на тэрмін да двух гадоў, ці пазбаўленьнем волі на той жа тэрмін. Гэта ня першы выклік А.Ясюк і А.Абрамовіча па справе. 5-га лютага іх ужо выклікалі сюды, але ў „якасьці сьведкаў". Пры гэтым А.Ясюк была дастаўленая ў пракуратуру прымусова (зь месца працы яе вывозіў нарад міліцыі). А.Абрамовіч зьявіўсяў пракуратуру без прымусу. А.Ясюк і А.Абрамовіч адмовіліся даваць паказаньні і падпісваць хоць што-небудзь, праявіўшы „грамадзянскае непадпарадкаваньне". (Нагадаем: *А.Абрамовіч, А.Ясюк, Надзея Грачуха, Зьміцер Кузьняцоў* і *Міхаіл Кузьняцоў* былі затрыманыя 16 студзеня на цэнтральнай плошчы Барысава падчас пікету, на якім яны патрабавалі неадкладнай медычнай экспэртызы стану псіхічнага здароўя А.Лукашэнкі.)

*7 лютага* стала вядома, што ў рэгіёнах ажыцьцяўляецца вялікі ціск на выбаршчыкаў. Выхавацелі аднаго з рабочых інтэрнатаў Берасьця (па вул.Суворава, 108) атрымалі заданьне ад адміністрацыі інтэрната абыйсьці ўсіх жыхароў, якія не прышлі на выбарчыя ўчасткі ў кастрычніку летась, ды абавязаць іх пад пагрозай высяленьня прыйсьці на давыбары ў сакавіку. Жыхары інтэрнату сцьвярджаюць, што „у мінулую выбарчую кампанію адміністрацыя інтэрнату літаральна за руку выводзіла людзей на ўчастак". Вынікі давыбараў вельмі важныя для беларускага рэжыму, бо Лукашэнку неабходна перад прэзыдэнцкімі выбарамі дапоўніць „палату прадстаўнікоў" вернымі яму людзьмі.

*8 лютага* Прэзыдыюм Выканаўчага бюро БСДГ (Народная Грамада) падрыхтаваў заяву, у якой патрабуе спыненьня крымінальнага перасьледу барысаўскіх сацыял-дэмакратаў *А.Абрамовіча, А.Ясюк, Н.Грачухі, непаўнагадовых братоў Кузьняцовых.*

***(Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс-служба БНФ.*** *Па матэрыялах Камісіі, СМІ (друку, радыё), „Вясны-96", SANA)*

## ІХНЫЯ НОРАВЫ

Менскім міліцыянтам не спадабаўся ***Андрэй Бельскі***, які ішоў з сябрам па вуліцы. Міліцыянты напалі на іх і пачалі збіваць палкамі і нагамі. Потым іх шчапілі за рукі кайданкамі і яшчэ раз зьбілі. Затым павезьлі ў пастарунак. Там іх ізноў пабілі і абшукалі. З кішэні А.Бельскага выцягнулі пракурорскае пасьведчаньне. Гэта на нейкі час зьбянтэжыла міліцыянтаў. Але потым яны знайшлі выхад і паведамілі, што складуць пратакол за быццам бы знаходжаньне на вуліцы ў нецьвярозым стане.

Калі ж супрацоўнік пракуратуры запатрабаваў, каб яго адвезьлі на экспэртызу на наяўнасьць алькаголю, міліцыянты вырашылі папросту яго адпусьціць.

На вуліцы А.Бельскі спытаў у вартавога прозьвішча старшыны, які яго зьбіваў. Вартавы крыкнуў: „Сярога, тут намагаюцца высьветліць тваё прозьвішча!"

„Сярога" (гэта быў старшына **Сяргей Малашэнка**) выбег, заламаў руку супрацоўніку пракуратуры і зацягнуў яго зноў у пастарунак. Там ён пагразіў Бельскаму: калі не падпіша заяву, што ня мае прэтэнзіяў да супрацоўнікаў міліцыі, яго зноў будуць біць.

А.Бельскі падпісаў заяву і на наступны дзень зьвярнуўся ў паліклініку (дзе зафіксаваў пабоі) і ў пракуратуру. Пракуратура Маскоўскага раёну (пасьля праверкі) узбудзіла крымінальную справу супраць С.Малашэнкі за перавышэньне ўлады.

Так што А.Бельскаму яшчэ пашанцавала. Несупрацоўнікаў пракуратуры ў лукашэнкаўскай міліцыі ня толькі зьбіваюць і калечаць, калі захочацца, але яшчэ і аддаюць пад суд.

***(Паводле радыё „Свабода". Л.Лунёва)***

## ПОШЛІНЫ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

Лукашэнка ўвёў для беларусаў пошліны на купляньне аўтамабіляў з Захаду. Напрыклад, стары аўтамабіль „Аўдзі-100" 1987 году выпуску каштуе ў Шчыціне 500-600 даляраў, а мытная пошліна на беларускай мяжы — 900 — 1150 даляраў і больш.

Гэтак Лукашэнка ахоўвае расейскі рынак і не дае магчымасьці беларусам выгадна гандляваць.

***П.Я.***

## РАСЕЯ ХОЧА ЗАХАПІЦЬ БЯРОЗАЎСКУЮ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ

Бярозаўская электрастанцыя за даўгі Лукашэнкі можа перайсьці ва ўласнасьць расейскага акцыянэрнага таварыства „адзінае энэргетычнае сістэмы", якой кіруе расейскі алігарх **А.Чубайс**. Гэтая навіна стала поўнай нечаканасьцю для супрацоўнікаў Бярозаўскай ДРЭС, якія бачылі добрыя пэрспэктывы ў сваёй працы. Меркавалі мадэрнізаваць станцыю. (Кошт паляпшэньня — каля 35 мільёнаў даляраў.) І раптам даведваюцца, што пад гэты „плян" іх проста хочуць здаць расейскаму капіталу.

4-га красавіка А.Чубайс заявіў у інтэрв'ю эстонскаму радыё, што будзе прапаноўваць суседнім з Расеяй краінам актыўна падтрымліваць праект продажу расейскай электраэнэргіі на Захад шляхам стварэньня адзінай энэргасістэмы. Пра тое, ці выгадны такі плян для „суседніх з Расеяй краінаў" гаворка, вядома, ня йшла.

***І.К.***

## БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

### *1939 год. Узьяднаньне Беларусі.*

*(Успамінае пэнсіянерка Люба Грыньчык з Бытэня. Менск.)*

Дзесьці ў 20-х днях к нам прыехалі першыя танкі. Першы танк, на ём наверсе салдаты сядзяць. Уехалі ў Бытэнь, саскочылі, а мы ўсе з кветкамі іх сустракалі. Старэйшыя людзі браму такую вялікую зрабілі, а мы так, кветкамі іх кідалі. Падыходзяць к нам. А мы ўсе ў белых каўнерыках — так у нас было прынята: хто вучыўся, усе ў белых каўнерыках. Падыходзяць к нам салдаты, і першае, што гавораць: „А што гэта ў вас за фашысцкая форма?"

Але ж мы ня ведалі, што такое слова „фашыст". Мы пераглядваемся.

— А што гэта ў вас за такія нумаркі на рукавах?

— Гэта нумар нашай школы, гаворым.

Пачалі курыць і вельмі плявалі ўдаль, на цэлыя 2 мэтры. Нам гэта так паказалася дзікім, бо ў нас людзі не плявалі, нашы людзі былі далікатнейшыя. Яны рагочуць, гавораць нешта.

— Девушкі, прынесіце стаканы.

Можа ваду піць? Так старацельна пабеглі, шклянкі пабралі. А яны што, не ваду піць, а пачалі бутэлькі адкаркоўваць і наліваць з бутэлек. Мы гэтага раней ня бачылі, бо нашы бацькі, дзяды, прадзеды толькі па вялікіх сьвятах гарэлку пілі, і то — маленечкімі кілішачкамі. І нам гэта ўжо было дзіка. Мы ўсё стараемся, каб знайсьці што харошае, бо свае ж прыехалі, але пакуль не находзім такога, каб да іх адразу так прыльнуць душой. І што гэта яны паміж сабою, гавораць, сьмяюцца і мат упатрабляюць. Мы гэта ніяк не маглі прыняць, таму што ну ніхто ў жыцьці ў нас не мацюгаўся. У нас мату не было, бо ў нас на першым месцы ў сьвідзецельства, што выдавалі за клясы, была рэлігія, а як рэлігія была, то як гэта можа быць, гэта ж несумяшчальна з матам. Мы ну ня верым у такое, што такое можа быць.

Пасьля ўжо пайшлі мы ў школу. Як наехала рускіх к нам. Прыехалі ня тое рускія, а бальшавікі, і вельмі многа (па нашаму так не гавораць, але калі гаварыць па-руску) — еврэяў. Так упэўнена адчуваюць, і у школе. Учыцель гісторыі ў нас, каторы ўчыў пра сталінскую канстытуцыю, Баркан фамілія. Дык ён сеў перад намі на першым уроку. Ці то ў яго насмарк быў. І вось ён узяў і смаркануў у клясе, далёка так і ботам зацёр, а пасьля толькі дастаў хустачку і нос выцер.

Нас сталі з першых жа дзён вучыць жыдоўскую песьню; трошку надаела.

У нас быў ручны труд. Пачалі сьмяяцца: „Зачэм, штобы дзевушкі шылі?" А мы гаворым, ну як жа ж без „ручнога труда"?" „А как сашьёте, так і будзет харашо". „А як жа ж мы добра сшыем. Вось нас жа вучаць маляваньню, каб мы красіва маглі намаляваць сабе выкрайку, каб красіва сшыць." „А зачем красіво? Как пошьёте, так і сойдет."

Як какія дзікары. „Труд" адмянілі.

Палякі жылі і ў школу з намі хадзілі. І вось прыйшоў 40-ы год, і палякаў гэтых усіх — у Сібір. У нашай Бытані была полька, родственіца прэзідэнта польскага Масьціцкага. Яна была адзінокая, і ўсё сваё багацьце, усе свае грошы аддавала быцінскім бедным. Дзеці, каб безнаглядныя не заставаліся, — яна іх завядзе і накорміць, каву дзяцям прыгатаўляла і смачнымі булачкамі пакорміць. Ну такая добрая цётка. І вось як пачаліся вывазы, то ня толькі палякаў, але і нашых, беларусаў, павезьлі. Раз у палякаў быў лесьніком, значыць гэта ўжо беларускі „враг народа". У 40-градусны мароз у 40-м годзе, калі сады памерзьлі, НКВД ці КГБ запалохалі; і тут яшчэ ўсё страху дадаюць людзям: „І вы ў сьпіску, і вас вывязуць", — каб ужо ўсё аддавалі і прадавалі заранёў. Зусім не вінаватых грузілі ў цялятнікі, такія печачкі рабілі, буржуйкі, і павезьлі нашых людзей.

Цётку гэтую, палячку адзінокую, што гэдак апекавалася людзьмі, што толькі людзям рабіла дабро, яе першую ўкінулі. А на ёй была футра. Зь яе садралі тую футру. Салдаты дазьдзіралі адзёжу са старушкі (ёй тады гадоў 70 было). Садралі яе, а ёй далі лахмоцьцяў.

Яна недалёка і ад’ехала — замерзла. Яе пахавалі, як і другіх, хто паміраў на дарозе — у адкосе. А ёй у Бытэні трэба было помнік паставіць, бо гэта — Маці-Тэрэза. А ў нас стаіць помнік Леніну. Ён у 18-м годзе нас аддаў пад Польшчу, і чаму яму стаяць помнікі ў Заходняй Беларусі — я гэта ніяк не магу зразумець.

А потым Сабор узарвалі... Страшэнны ўзрыў — увесь купал абваліўся. Нічога не было відаць, толькі пыл гэтакі, слуп такі агромны, аж да самага неба. Сколькі часу прайшло, пакуль ужо той пыл асеў і ўжо ўбачылі: на тым месцы, дзе быў Сабор, — нічога няма. Як вухнула, мама на калені стала, хрысьціцца: „Госпадзі!”

І прайшоў нейкі час, і сталі людзі ўжо грузіць і везьці і дарогу масьціць гэтай цэглай...

Вось так у нас было ўзьяднаньне пры бальшавіках.

***(Паводле радыё „Свабода”)***

## ... І там памерці

*(Людзьміла Баркоўская, інвалід ІІ-й групы*
*з Магілёўскага інтэрнату для старых „Салтанаўка”)*

„Няма больш сілы цярпець прыніжэньні і зьдзекі ў гэтым інтэрнаце. Даводзяць да такой ступені, што вымушаная бадзяжнічаць і прасіць міласціны ў людзей на кавалак хлеба. Уся хворая, брудная, сілаў няма. Харчаваньне вельмі слабое, лекі перасталі даваць, вакол бруд, прусакі не даюць спакою. Вады гарачай няма — хутка зарасьцем вашыма. І ўсе вакол п’юць гарэлку па-страшнаму (і работнікі, і тыя, хто жыве ў інтэрнаце).

Вельмі хацелася, каб мне дапамаглі, пахадайнічалі, каб мяне перавялі адсюль у Бабруйскі Каменскі дом-інтэрнат. Усё ж хацелася б быць бліжэй да дому, да Радзімы і там памерці. Хоць ад гэтага лягчэй.”

***(Паводле радыё „Свабода”)***

## У Аўганістане

*(Расказвае Уладзімер Раманцоў. Менск)*

У Аўганістан ваяваць я пайшоў дабраахвотнікам — настолькі моцна працавала савецкая прапаганда. А рэчаіснасьць аказалася зусім іншай, чым малявала нам прапаганда. Вось некалькі эпізодаў „вызваленчай выправы”.

Увосень 1984 г. я трапіў у шпіталь, захварэў быў на тыф. Было нас у афіцэрскай палаце 10 або 12, лейтэнанты, маёры, усе цяжка хворыя, ляжачыя. Аднойчы ўваліўся ў палату падпалкоўнік, начальнік аддзяленьня. На добрым падпітку, у суправаджэньні мэдсёстраў. Пачаў лаяцца і зьдзекліва гарлапаніць: „Што вы тут валяецеся? Усіх на фронт! Там трэба гарматнае мяса!” Усе абурыліся, пратэставалі, толькі не маглі даць яму дыхту.

Мэдслужбы бессаромна абкрадалі хворых. Есьці давалі мокры хлеб ды камсу. Жаўнерам было яшчэ горай. Тлустыя прапаршчыкі на складах і кухні забіралі лепшае сабе. Часам згаладнелыя жаўнеры кідаліся да нас, хапалі якое пячэньне і ўцякалі. Ніхто іх за гэта не хацеў караць.

Аднойчы мы пайшлі ў рэйд, прыстаўленыя карэктыроўшчыкамі да мота-стралковага батальёну. І патрапілі ў пастку каля старажытнай крэпасьці. Душманы (так мы называлі тады аўганскіх партызанаў) пачалі нас абстрэльваць, адразу забілі царандоя. (Так называлі аўганскіх жаўнераў прасавецкага рэжыму. Мы ведалі, як іх мабілізавалі. Войскі абкружалі кішлак і лавілі ўсіх юнакоў. Часьцяком бывала, што бацька быў у партызанах, а сын — у царандоях .)

Усе залеглі. Мы пасьпелі кінуцца ў арык, а на полі далей застаўся ляжаць узвод лейтэнанта Генадзя Бардана (наш, з Гарадзеншчыны). Па пояс у халоднай вадзе, мы прабіраліся да крэпасьці. Агонь быў моцны, адзін з жаўнераў ня вытрымаў, пачалася зь ім істэрыка. Выскачыў наверх, дзіка рагатаў, ледзь зацягнулі яго назад. Партызанаў мы з крэпасьці выбілі. А беларус Генадзь Бардан загінуў. Меркавалі тады, што хутчэй за ўсё застрэлілі яго ў сьпіну тыя царандоі, такія былі хаўрусьнікі. Пад агнём выцягваў ягоны труп таксама беларус з Гарадзеншчыны, Лявон, намесьнік камандзіра ўзводу.

Гэта няпраўда, што вайна дае нейкі станоўчы досьвед. Не, выключна адмоўны. Нас уцягнулі ў чужую грамадзянскую вайну. У Аўганістане мы ўбачылі падзеленае грамадства. А да партызанаў няма ў мяне цяпер нянавісьці. Яны баранілі свае традыцыі, свой лад жыцьця, сваю зямлю. Не прымалі навязаны парадак.

Сьмелыя ваяры. На іх кінулі самалёты, верталёты, артылерыю. А яны эфэктыўна змагаліся, маючы толькі гранатамёты ды безаткатныя гарматы. Паспрабуй з такой зброяй змагацца з танкамі! А яны перамаглі.

Калі б мы мелі сваю дзяржаву, то ня гінулі б беларусы на аўганскай вайне. Не ваявалі б за інтарэсы расейскай імпэрыі. Засталіся б жывыя нашыя людзі.

А беларускія вайскоўцы паказалі сябе з найлепшага боку. Беларусы трывушчыя, цягавітыя, умеюць загад выконваць.

## Асабісты

*(Расказвае Іосіф Іваноўскі. Капыль)*

Масква ськівала на парашутах заўсёды цэлую групу: асабіст, радыст і начальнік выведкі. І потым ужо асабісты распараджаліся і камандавалі партызанамі.

Аднойчы мы атрымалі загад захапіць вёску *Вішнявец*. Там было некалькі паліцэйскіх. Быў кароткі бой. Хто бараніўся, таго забілі. А ў мясцовых хлопцаў з атраду самапомачы не было нават зброі. Іх проста схапілі. Упраглі, як коней, у вазы. І пагналі ў вёску *Вусава*, дзе быў партызанскі штаб. Мы іх хацелі адпусьціць, але асабіст-маскаль загадаў пакараць тых хлопцаў.

Іх распранулі дагала, прывязалі да дрэваў і пакінулі. Усе яны загінулі, заедзеныя машкарой.

## Чаму плакаў гаспадар

*(Расказвае Ўладзімер Юхо. Менск)*

Памятаю Капыль канца 50-х гадоў. Калгасы дайшлі да нас пазьней, чымсьці па ўсёй Беларусі. Мясцовы люд меў заможныя гаспадаркі, хутка падняўся на ногі пасьля вайны. У выходны або сьвяточны дзень на цэнтральнай вуліцы ладзілі кірмаш. Было ўсяго. З Баранавічаў, дзе быў ваенны аэрадром і шмат расейскіх частак, прыязджалі цэлыя кавалькады машынаў з афіцэрамі ды іхнімі жонкамі. І несьлі з кірмаша масла, малако, яйкі, мяса, сала... Аднак ня доўга працягвалася гэтая яркая карціна.

Аднойчы заехаў да нас у хату сваяк зь вёскі. То быў сапраўдны гаспадар на зямлі, якіх шмат было тады на багатай Капыльшчыне. А тут чую, як ён кажа нешта бацькам і плача. Калі ён зьехаў, мне патлумачылі, што сталася. Калгас абрэзаў яму зямлю „пад самыя вокны”. Ня стала чым нават сваю сям’ю жывіць. І вось, сьпілаваўшы дзьве старыя бярозы, гаспадар прыехаў у горад прадаваць дровы.

* * *

Адначасова з хрушчоўскай авантурай на цаліне, куды паслалі тысячы беларусаў, пачалася і ў нас барацьба супраць прыроды пад назвай „асушэньне”. Гналі экскаватары і капалі простыя траншэі па 3 мэтры глыбінёй для адтоку вады.

Рака *Лань*, паўнаводная і чыстая, стала па калені. Зьнікла вада ў калодзежах, якія давалі ваду сотні гадоў. Высахлі балоты, зьніклі цэлыя віды птушак. Напрыклад, чорны жуowlравель, які прылятаў да нас тысячагоддзямі. Зямля высахла, зморшчылася. На Ганцаўшчыне і Капыльшчыне мы ўбачылі пяшчаныя дзюны!

Урадлівасьць рэзка зьнізілася. Праз колькі гадоў саветы пачалі „мэліярацыю”. Ставілі на штучных каналах заслонкі, трымаючы ваду. Ды цяпер ужо тыя заслонкі паіржавелі, пагнілі. Праз дзесяцігоддзі пасьля злачынных экспэрымэнтаў над нашай зямлёй прырода патроху пачала аднаўляць сваю сілу.

## ДЗЕЯПІС ВЫЗВОЛЬНАГА РУХУ

Жыве Беларусь.

***Жодзіна***. Актывісты *Жодзінскай арганізацыі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі 2-га красавіка пікетаваньне ў знак пратэсту супраць плянаў інкарпарацыі Беларусі ў Расею. Санкцыянаваная акцыя адбывалася пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі.* Лідары арганізацыі ***Віктар Юркевіч*** ды ***Іраіда Місько*** зьбіралі подпісы пад зваротам насельніцтва да міжнароднай грамадзкасьці, каб яна не дапусьціла паглынаньня Беларусі Расеяй.

Праз 30 хвілінаў да іх далучыліся прадстаўнікі ТБМ і пачалі збор подпісаў за адкрыцьцё ў Менску нацыянальнага ўнівэрсітэту. Жодзінцы з разуменьнем ставіліся да пікетоўшчыкаў, падпісваліся пад абодвума дакумантамі. Некаторыя савецкія пэнсіянеры кідаліся на плякаты і спрабавалі парваць. Але іх адводзілі ад плякатаў.

***У Барысаве*** тым часам актывісты „Народнай Грамады" Аляксандар Абрамовіч і Алеся Ясюк, апранутыя ў мэдычныя халаты,



**Сьцяг высокага напружаньня.**

у розных месцах гораду зьбіралі ахвяраваньні дзеля лячэньня хворых „на інтэграцыю" (а моладзь — на пэнсію галоўнаму інтэгратару).

***У Койданаве*** да позьняга вечара вялікая група сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* з падпіснымі лістамі хадзіла па горадзе і агітавала землякоў выказацца супраць інкарпарацыі Беларусі ў Расею.

***У Слуцку*** раськідалі ўлёткі, у якіх заклікалі случакоў адстойваць сувэрэнітэт Беларусі.

***Баранавічы***. Адбыўся пікет *Кансэрватыўна-Хрысьціянкай Партыі — БНФ* у „маладым парку" 2 красавіка. Ён меў антыінтэграцыйны характар. Тэматыка лёзунгаў была адпаведнай: „***Не дазволім акупаваць Беларусь!"; „Незалежнасьць Беларусі — гарантыя будучыні"; „Беларусь — мая зямля!"; „Жыве Беларусь!"***.

Цэнтральнае месца ў пікеце займаў лёзунг-цытата з „*Ліста з-пад шыбеніцы*" ***Кастуся Каліноўскага***: „***Тады, мой народзе, зажывеш шчасьліва, калі маскаля над табою ня будзе"***.

Падчас акцыі, у якой удзельнічала каля 20 чалавек, раздаваўся бюлетэнь *Беларускага Вызвольнага Руху „Беларуская Салідарнасьць"*, а гэтаксама ліст Зянона Пазьняка да беларусаў *„Асьцерагайцеся чарцей з табакеркі"*.

З боку за акцыяй назіралі чыноўнікі з гарвыканкаму ды група міліцыянтаў. Яны ня ўмешваліся, бо ўсё прайшло зладжана ды спакойна.

***(З радыё. А. Мікалайчанка, А. Горбач)***

***Мірон.*** *5 красавіка.* На ўезьдзе ў Лёзна з боку Віцебску на 30-мэтровай ЛЭП напругай каля 35 тысячаў вольт зьявіўся *Беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.* Сьцяг трымаўся на апоры да сярэдзіны дня, пакуль зь Віцебску не прыехала спэцыяльна выкліканая брыгада. З выкарыстаньнем спэцыяльнай тэхнікі сьцяг зьнялі і знайшлі прымацаваную да яго традыцыйную цыдулку Мірона.

## ЗЬВЕСТКІ З ПІНСКУ

У апошні час рэжым распладзіў мноства арганізацыяў, якія адлюстроўваюць структуру 5-й калёны ў Беларусі. На іх спускаюцца сродкі, ім даюцца старонкі афіцыйных газэтаў, зь імі супрацоўнічаюць улады, чытаюць іхныя даносы і паклёпы на *Беларускі Вызвольны Рух* і г.д.

Ніжэй падаём намэнклятуру антыбеларускіх арганізацыяў і аб'яднаньняў у Пінску (на 17 лютага 2001 г.)

1. Беларускі народна-патрыятычны саюз (БНПС) Старшыня — Воран В.А., намесьнік — Ягораў Н.І., сакратар — Галахоўская Г.Д., прэс-сакратар — Нагорнаў А.І.
2. Каардынацыйны савет левых народна-патрыятычных сіл сацыялістычнай арыентацыі ПКБ, ЛКСМБ, „Працоўны саюз".
3. Грамадзкае фармаваньне „Працоўны саюз"; старшыня Хлебус А.С.
4. Беларускае грамадзкае аб'яднаньне ветэранаў (БГАВ) (70 суполак; 1 суполка — 10 чалавек і болей) Усяго 25000 чалавек.
5. Беларускі саюз афіцэраў (Такарчук Б.А.)
6. Саюз ваенных маракоў (Арлоў В.Д.)
7. Асацыяцыя інвалідаў вайны (Тарадайка Л.В.)
8. Савет партызан (Сушко К.І.)
9. Таварыства партызан-ветэранаў (Пчолка Е.П.)
10. Таварыства воінаў-інтэрнацыяналістаў — 430 чалавек
11. БПСМ — 1870 чалавек (першы сакратар — Берасьцень І.Н.)
12. ЛКСМБ
13. КПБ
14. ПКБ
15. Расейская праваслаўная царква (РПЦ)
16. Выбарчыя камісіі (сябры) — удзельнікі фальсіфікацыяў вынікаў выбараў
17. Піянерскія арганізацыі (дзіцячыя)

Пэнсіянеры канвойных войскаў, стукачы-дабраахвотнікі, філёры, сышчыкі, вэтэраны ВОХРЫ, КДБ, МУС і г.д.

***ПІНЧУК***

## ДЫК ХТО ЁН?

Амбасадар рэжыму Лукашэнкі ў Маскве **Уладзімер Грыгор'еў** даў інтэрв'ю газэце „Саюз" (частка газэты „Советская Белоруссия"). На пытаньне („Ці праўда, што беларускі амбасадар мае расейскі пашпарт?") сп.Грыгор'еў адказаў: „Так, гэта сапраўды так. Я яшчэ не мяняў свой пашпарт. Ён выдадзены 109-м аддзяленьнем міліцыі Масквы".

У той жа час прэс-сакратар МЗС Беларусі П. Латушка сказаў, што У.Грыгор'еў ніколі ня меў расейскага грамадзянства. „Ён грамадзянін Беларусі, прапісаны пастаянна ў Віцебску з 27 сакавіка 1987 г."

***Р.С.***

# ЭГАЛІТАРЫЗМ

У 80-х гадах мінулага стагоддзя немінучы распад СССР адчуваўся ў паветры. У Эстоніі, Латвіі, Летуве толькі і размоваў было пра вяртаньне суверэнітэту ды незалежнасьці.

У Беларусі ўзьнікла крыху іншая карціна. Пачынаючы ад гарбачоўскай перабудовы, як толькі зьбяруцца якія-небудзь палітыкі, то абавязкова будуць гаварыць пра эканоміку ды пра рэформы. Як правіла, нехта скажа (і ўсе пагодзяцца), што эканоміка — гэта галоўнае, што бяз добрай эканомікі нічога ня будзе, што найважнейшае — гэта эканамічныя рэформы і г.д.

Пэўна, што так. Ад эканамічнага ўладкаваньня грамадзтва шмат што залежыць. ***Толькі ў аснове добрай эканомікі павінны быць добрыя людзі.*** Інакш нічога прыстойнага не атрымаецца. Галоўным у эканоміцы ёсьць маральны чыньнік чалавека — пісаў вялікі эканаміст Адам Сміт. І сапраўды, якія эканамічныя рэформы можна рабіць, напрыклад, у грамадзтве, дзе шмат людзей прывыклі ашукваць і красьці, дзе існуе павальнае п’янства, дзе людзі ня любяць працаваць, бо праца абясцэненая, дзе ў грамадзтве няма духоўных ідэалаў і агульнанацыянальных каштоўнасьцяў, а дачыненьні паміж людзьмі ўзьнікаюць на падставе нянавісьці. Калі ў такім грамадзтве пачынаюць эканамічныя рэформы, то багатымі людзьмі ў выніку становяцца найбольш злодзеі і нягоднікі, якія, зрабіўшыся заможнымі, да таго ж, захопліваюць уладу. Прыкладаў шмат, ад Паўднёвай Амэрыкі ды Афрыкі да прастораў Расеі.

У аснове абсалютызаваных разважаньняў пра эканоміку як самадастатковую вартасьць знаходзяцца ўяўленьні, выхаваныя на бязбожніцтве і матэрыялізме, калі асобу чалавека ня толькі не паважаюць, але ўвогуле не прымаюць у разьлік. Ад эканамічнага рэфарматарства ў такім грамадзтве часта простая дарожка да таталітарнай дыктатуры.

Справа часьцей за ўсё зусім ня ў дрэнных эканамічных праграмах. Справа ў людзях. Грамадзтва можа мець інтэлектуальныя рэсурсы (зрэшты, можа іх купіць у іншым грамадзтве), каб скласьці добрыя эканамічныя праграмы рэформаў. Але пойдуць яны кепска, наперакос, прывядуць да пабочных вынікаў, бо не хапіла патрэбных ***маральных людзкіх рэсурсаў***.

Можна глядзець на Захад і на Ўсход — усюды гэтыя прыклады ўбачым, толькі на розным узроўні і ў розным выяўленьні.

Палітыкаў, якія асновай добрага існаваньня грамадзтва і ўсяго чалавечага жыцьця лічаць толькі эканоміку, ня трэба й слухаць. Гэта, як правіла, папулісты і абмежаваныя людзі. Ім лепш прафэсійна займацца эканомікай і не набліжацца да палітычнай улады. ***Бо ўлада і палітыка — гэта перш за ўсё адказнасьць за людзей і за ўсю нацыю.*** Тут трэба ўлічваць ня толькі эканоміку.

У Беларусі, прынамсі на працягу апошніх 200 гадоў існаваньня пад акупацыяй, бальшыня ўнутраных сацыяльна-псіхічных і маральных зьменаў у грамадзтве выкліканыя зьнешнепалітычным чыньнікам. Менавіта бесперашкоднасьцю палітычна-праўнага, інфармацыйнага і сацыяльнага пранікненьня расейскіх стэрэатыпаў у беларускую сацыяльна-культурную супольнасьць.

Далучанасьць Беларусі да адзінага савецкага грамадзтва абазначала і далучанасьць яе да хваробаў гэтага грамадзтва, да інфэкцыі чужародных заганаў.

Часта ў грамадзтве (мы разглядаем тыя чалавечыя грамадзтвы, якія існуюць на ўзроўні дзяржаўных утварэньняў) нейкая загана фармуецца як традыцыйная грамадзкая зьява (напрыклад, кроўная помста ці п’янства ў некаторых краінах). Тады яна ўхваляецца часткай народа і дзейнічае як тормаз любога нацыянальнага прагрэсу.

Зьяву можна разглядаць як агульную хваробу грамадзтва, змагацца зь якой ня так проста, бо яна заўсёды мае ня толькі маральныя, але і сацыяльныя, і эканамічныя, культурныя, палітычныя і іншыя карэньні.

У пляне эканамічнага разьвіцьця найбольш небясьпечнай грамадзкай заганай зьяўляецца, на маю думку, эгалітарызм — грамадзкае выяўленьне зайздрасьці, якое рэалізуецца як раўненьне па ніжнім узроўні. Эгалітарная супольнасьць страчвае імкненьне да лепшага, да перайманьня добрых прыкладаў, да ўдасканальваньня. Яна перастае разьвівацца. Глыбокі застой зьмяняецца рэгрэсам і адсталасьцю.

Эгалітарызм распаўсюджаны ў асноўным сярод бедных пластоў насельніцтва, характэрны таксама для люмпена і люмпенскай псіхалёгіі. Гэтая зьява найчасьцей спатыкаецца на ўсходзе Эўропы, найбольш у Расеі і далей на ўсход.

Беларусы, якім прыходзілася выязджаць зь Беларусі і доўгі час жыць у Расеі, асабліва ў рускай сельскай мясцовасьці, добра ведаюць, што такое нянавісьць да лепшага.

Беларус ня можа бяз працы. Таму, пасяліўшыся з сям’ёй у рускай вёсцы, ён заводзіў гаспадарку, трымаў карову, сьвіней, курэй, індыкоў ды качак, садзіў сад, упраўляў гарод, шаляваў хату, ставіў гаспадарчыя пабудовы, капаў склеп ды студню, абгароджваў усё добрым плотам, працаваў і ўсё неабходнае меў.

Рускія сельскія жыхары, большасьць зь якіх (асабліва вакол вялікіх гарадоў) здавён не трымаюць жывёлы, ня маюць ні садоў, ні платоў і кожны дзень п’яныя, ацэньвалі такое жыцьцё беларуса заўсёды варожа. „Вось куркуль, вось прагны, яму больш за ўсіх трэба, дурны беларус,” — казалі яны пра яго. Кожны стараўся зрабіць яму цішком непрыемнасьць: то штанкет адарваць, то гусь колам пераехаць, то цяля атруціць, то сад спляндраваць. Часам даходзіла да адкрытых пагрозаў: „Ты, — казалі рускія, — тут не старайся, усяроўна спалім”.

Тым часам яны заўсёды нечага прасілі ў беларуса. Ведаю гісторыі, што калі прыходзіла пара калоць парсюка, то ў чаргу да беларуса па мяса ды сала выстройвалася цэлая руская вёска. І ўсім давалася. Але гэта ніяк не зьмяняла адносіны да беларуса: „Вишь, куркуль, всё имеет,” — казалі пасьля сала.

Ведаю выпадкі, калі такога беларуса ў рускай вёсцы спальвалі, ведаю, калі беларус кідаў усё і зьязджаў, але ніводнага ня ведаю прыкладу, каб нехта з такіх рускіх людзей нечаму добраму ў беларуса навучыўся, нешта добрае ў яго пераняў, ці хоць бы паважаў яго за працу і заможнасьць.

Тут не ксэнафобія. Тут якраз выяўляецца псіхалёгія эгалітарызму. Менавіта на эгалітарызм абапіраліся бальшавікі, калі стваралі розныя „камбеды”, вынішчалі заможных сялян („кулакоў”) і разбуралі вёску. Нянавісьць да багацейшых, да вольнай працы, што стварае багацьце, да ўсяго лепшага, чыстага, адукаванага, інтэлегентнага стала афіцыйнай псіхалёгіяй у рускай камуністычнай імпэрыі. Гэтая псіхалёгія падтрымлівалася і ўхвалялася, і называлася „клясавай нянавісьцю”.

У Расеі эгалітарызм быў глыбока ўкаранёны ў сьвядомасьць яшчэ за прыгонным правам. Нідзе прыгоннае права не было такім жорсткім і нідзе не пратрывала так доўга, як у Расеі. (Да 1861 года за царом і з 1930 па 1991 — за камуністамі).

У Беларусі праявы эгалітарызму сталі відаць найбольш у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі самыя актыўныя людзі ў вёсцы на кароткі час здолелі выбіцца на самастойныя таварныя гаспадаркі (так званыя „фермеры”).

Шмат дзе калгасны люд адносіўся варожа да тых гаспадароў, справы якіх пайшлі ўгару. Зафіксаваныя нават выпадкі атручваньня быдла і рабленьне нематываванай шкоды. Маўляў, не высоўвайся, ня лепшай, не багацей, жыві дрэнна, як мы, гэта, маўляў, нармальна.

Тое, што праявы эгалітарызму ў агрэсіўнай форме ёсьць у Беларусі — гэта найбольш вынік камунізму ды калгаснага ладу. Тут выяўленьне псіхалёгіі несвабоднай асобы, а таксама наступствы усёй сістэмы камуністычнага выхаваньня і адносінаў да працы як да працэсу, адасобленага ад канкрэтнага чалавека.

Вольныя і маральна выхаваныя людзі ў вольным грамадзтве паводзяць сябе інакш. Калі немец ці амэрыканец бачыць, як побач зь

ім багацее сусед і нешта разумнае робіць, што дае яму выгаду, то ацэнка суседзкага посьпеху выяўляецца не ў эгалітарнай зайздрасьці, не ў жаданьні нашкодзіць бліжняму, каб той ня лепшаў ды не багацеў, а ў імкненьні павучыцца ў яго і зрабіць гэтак сама, а то й лепш, каб дасягнуць свайго посьпеху.

У свабодных грамадствах, дзе цэніцца вольная праца (а не нявольніцкая ды прымусовая), дзе існуюць нацыянальныя традыцыі культуры, дзе ёсьць павага да Бога і да чалавека, там заможных, пасьпяховых людзей паважаюць. Там кіруюцца на вышэйшае, на лепшпе.

У супольнасьці, дзе пануе эгалітарызм, багатых людзей ня любяць, ім зайздросьцяць і ненавідзяць. У іх могуць прасіць, але не вучыцца.

У эгалітарнай супольнасьці нішчыцца і зьнікае вольная праца. Тут узаемасувязь і замкнутае кола. І ня так проста зь яго выйсьці пры дапамозе адных толькі эканамічных рэформаў. Бо ўзьнікае цэлы ланцуг нездаровых паводзінаў.

Канкурэнцыя ў свабодным грамадстве, напрыклад, вырашаецца разумна. Калі нейкі вытворца вытварае такі ж самы тавар, як іншы вытворца, але па танейшай цане, то іншы вытворца пачынае думаць, як скараціць выдаткі на вытворчасьць, увесьці новыя тэхналёгіі, павялічыць гандлёвы абарот і г.д., каб выраўняць цану.

У супольнасьці, дзе пануе эгалітарная псіхалёгія, праблемы канкурэнцыі вырашаюцца як у Расеі. Вытворца пачынае думаць, дзе б гэта наняць кілера, каб застрэліць канкурэнта. (Ці ў лепшым выпадку спаліць альбо нашкодзіць.) Эгалітарная псіхалёгія спараджае крымінальную сьведамасьць.

Успамінаю выпадкі ў сваёй дэпутацкай практыцы. Падыходзіць да мяне ў Менску адзін пэнсіянер-ветэран і кажа, што ўсе гандлёвыя кіёскі-шапікі ў горадзе трэба спаліць і забараніць, бо крывапіўцы-гандляры жывуць на целе народа.

— А хто вам пэнсію выплочвае? — пытаю.

— Дзяржава.

— А вы ведаеце, што латошнікі і прыватны сэктар у Менску плацяць 56 адсоткаў усіх падаткаў па горадзе. Калі іх ня будзе — адкуль грошы ў дзяржаве, адкуль вам пэнсія? — кажу я.

— Всё равно нада сжэч. Жыруют на нашы пенсіі, — быў адказ.

11-га сакавіка гэтага году на рускім тэлеканале *НТВ* паказалі такі дакумэнтальны сюжэт, зьняты ў Тульскай вобласьці Расеі.

У вёску прыехала прыстойная адукаваная жанчына сярэдніх гадоў і пачала апекавацца бяздомнымі сабакамі. Яна ўладкавала ў сваім доме і двары 52 сабакі, карміла і даглядала іх. Гэта выклікала лютую нянавісьць аднавяскоўцаў. „Людям кушать нечево, а она собак кормит,” — такая была ацэнка.

Неўзабаве яе дом падпалілі. Калі дом гарэў, аднавяскоўцы глядзелі, як ён гарыць, а жанчына аднаго за другім выносіла сабак з агню. Калі яна ўскочыла ў палаючы дом, каб вынесьці чарговага сабаку, дах абваліўся і жанчына згарэла разам зь няшчаснымі жывёламі.

Потым аднавяскоўцы прышлі на пажарышча разам зь міліцанерам і пазабівалі ўсіх 27 сабак, якіх пасьпела вынесьці з агню загінуўшая жанчына. Трупы сабак так і засталіся ляжаць на зямлі, ніхто іх нават не закапаў.

Неўзабаве ў вёску прыехалі з гораду дачка і зяць згарэўшай кабеты і кажуць пажарніку, што хацелі б пахаваць маці па-хрысьціянску і шукаюць яе рэшткі.

— Вот, забірайте — всё, что осталось, — паказаў пажарнік на бруднае вядро з абгарэлымі касьцьмі і падкінуў яго нагой.

Камэнтаваць гэтае дзікунства я ня буду. Тым больш, што ў цывілізаваных людзей такое ня ўкладваецца ў галаве. Адзначу толькі, што гэты выпадак тыповы для псіхалёгіі эгалітарнай супольнасьці. Тут нянавісьць да непадобнага, да іншага нязвыклага разуменьня, да ўзвышаных паняцьцяў, да стылю паводзінаў, які ўспрымаецца падсьведама ў эгалітарнай супольнасьці, як дакор нікчэмнаму і прывычнаму існаваньню. Тут спрацоўвае рэакцыя статкавага інстынкту.

Зазначу, аднак, што ў маскоўцаў (гэта адзначае і гістарычная этнаграфія) сабака лічыўся нячыстай жывёлай. Маскоўцы сабак білі і ня мелі да іх ніякай ласкі і сантымэнтаў. Дачыненьні да сабакі адлюстраваныя і ў рускіх прымаўках ды выслоўях (накшталт „бить, как собаку”) і нават у паэзіі. (Напрыклад, рускі паэт Ясенін мастацкім узорам сваёй дабрыні лічыў той факт, што ён сабак ня біў па галаве. Такая вобразная аргумэнтацыя магла нарадзіцца толькі ў сьведамасьці рускага паэта.)

Аднак выпадак у Тульскай вобласьці вынікае не з этнічных, а менавіта з эгалітарных уяўленьняў. Этнічная падсьведамасьць магла, магчыма, толькі падтрымліваць эгалітарную матывацыю.

Памятаю, у канцы 60-х гадоў, пасьля савецкай інвазіі ў Чэхаславаччыну, задаю пытаньне рускаму інтэлігенту (па адукацыі інжэнер, любіць опэрную музыку, зьбірае кружэлкі з запісамі рускіх хораў, носіць гальштук).

— Чаму вы ўвялі войскі ў Чэхаславаччыну?

— Потому что надо этих чехов проучить.

— За што — гэта ж краіна сацыялізму?

— Неважно! Зажрались, трамваи у них бесплатныи, — такі быў адказ.

Падобных ацэнак, як гэтая, мне прыходзілася чуць ад расейцаў сотні разоў. Прытым ні адукацыйны, ні сацыяльны цэнз не адыгрываў тут практычна аніякай ролі.

Ня думаю, аднак, што калі прыйдзе час на свабоду ды на эканамічныя рэформы ў Беларусі, то мы будзем мець праблемы з агрэсіўнай псіхалёгіяй грамадзкай зайздрасьці ў такім маштабе, як у Расеі. Але паколькі такая псіхалёгія ў нас таксама існуе ў розных пластах грамадства, то можна не сумнявацца, што яна праявіцца нэгатыўна ў эканамічных дачыненьнях.

***Эканоміка не бывае касмапалітычнай. Эканоміка — гэта заўсёды нацыянальная людзкая справа, якая датычыць усіх і кожнага паасобку.*** Толькі асьвета, культура і адукацыя на аснове нацыянальных і хрысьціянскіх каштоўнасьцяў, калі яны будуць улічвацца разам з рэформамі ў эканоміцы, змогуць амартызаваць разбураныя праявы эгалітарызму ў грамадзкім жыцьці і паскорыць працэс выхаду з савецкай сістэмы ў цывілізацыйнае грамадства нацыянальнай культуры, эканамічнага парадку і забясьпечаных добрых людзей.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*12 сакавіка 2001 г.*
*Нью-Ёрк*

# ЗА КАМПАНІЮ І „ДЭМАКРАТЫЮ...”

У кагэбоўскай Расеі сутыкнуліся дзьве бізнэсовыя групы. Група, набліжаная да прэзыдэнта Расеі Пуціна і „Газпраму”, вырашыла загарнуць у свае рукі ўласнасьць тэле-кампаніі „НТВ”, якая належыць расейскаму алігарху Гусінскаму. Дырэктарам яе, між іншым, зьяўляецца штатны агент КГБ Я. Кісялёў.

Змаганьне йшло за грошы, даходы, маёмасьць, уплывы і кантроль над інфармацыяй. Рускі КГБ пастанавіў забраць алігархічны капітал у свае рукі. Гэтак спляжылі ўсясільнага Беразоўскага, а цяпер атакавалі Гусінскага.

Падняўся вялікі штучны вэрхал, зададзенасьць якога была відавочнай, бо ўсё было разьмеркавана , і кожны мафіёзі гэта разумеў, але захоўвалі твар перад публікай.

Неўзабаве „рэбята” зрабілі ўсё, як трэба, і на экранах НТВ у ролі дыктараў і вядучых зьявіліся клясычна-гэбісцкія фізіяноміі, якія не схаваеш ні за якім цывільным касьцюмам. Пайшла „правільная” інфармацыя пра вайну ў Чачэніі і жыцьцё у Расеі. Калектыў НТВ

(ізноў жа, разам з Кісялёвым) перайшоў на „запасныя кватэры” (у іншую тэлекампанію).

Уся гэтая расейская валтузьня ня мела да Беларусі аніякага дачыненьня. Кампанія НТВ, безумоўна, была больш незалежная і больш аб’ектыўная, чым усе іншыя рускія тэле-кампаніі, але яна ніколі не выяўляла ня толькі павагі да беларускага суверэнітэту і беларускага народу, але нават элемэнтарных нармальных адносінаў, бо падтрымлівала, як і ўсе ў Расеі, імпэрскую палітыку „інтэграцыі” ў дачыненьні да Беларусі.

І ўвогуле, гэта расейскія „сямейныя” справы. Якая там дэмакратыя! Якія там „дэмакраты” — мы ведаем. Але, як кажуць, за кампанію і цыган павесіўся.

Як паведаміла радыё, у Менску знайшліся „прыхільнікі НТВ” і „дэмакраты”, якія наладзілі акцыю салідарнасьці з расейскім тэлеканалам.

Некалькі чалавек з „Хартыі”, хтосьці з маладых і рэдактар Павал Жук сабраліся на вуліцы Крапоткіна і крычалі: „Жыве НТВ!”, „Няхай жыве Кісялёў!”

***Адам МІКША***

## ПРЭС-РЭЛІЗ

*(па матэрыялах „Народнай Волі”, „Пагоні”, „БДГ”, „Нашай Свабоды”, „Вясны-96”,SANA; студзень-красавік 2001 г.)*

■ Расею ставяць на месца. Амэрыканскі міністр абароны Дональд Рамсфілд даў рэзкі адказ Расеі на яе шматлікія пратэсты супроць арганізацыі Нацыянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны ў ЗША. Па словах Рамсфілда, Расея сама справакавала стварэньне сістэмы НСРА, прадаючы стратэгічныя ракеты і тэхналёгіі Ірану, Паўночнай Карэі і Індыі, і таму не павінна цяпер „выказваць заклапочанасьць”. „Натуральна ім выгадна выказваць заклапочанасьць з гэтай нагоды, але давайце разьбяромся, чым, уласна кажучы, займаецца Расея.—сказаў міністар. Расея – актыўны распаўсюднік ракетаў. Яна зьяўляецца часткай гэтай праблемы. Яна прадае краінам накшталт Ірана тэхналёгіі, якія ўяўляюць пагрозу для жыхароў ЗША, Заходняй Эўропы, Блізкага Ўсходу. І тое, што яны распаўсюджваюць ракеты, а потым скардзяцца, што ЗША хочуць абараніцца, калі ЗША хочуць абараніць сябе ад вынікаў гэтага распаўсюджваньня, мне падаецца дзіўным”. Міністр дадаў, што да таго ж сістэма здольная зьбіць толькі невялікую колькасьць ракетаў, а Расея можа запускаць іх сотнямі.

■ Магілу памерлага нядаўна вертыкальшчыка А.Дубко (памятаеце, „галасуйце за Дубко – будзе хлеб і малако...”) ужо тыдзень ахоўвае міліцыя. Дзяжурства ідзе ў дзьве зьмены па 12 гадзінаў. Адна з асноўных задачаў аховы – захаваць вянкі, сярод якіх адзін ад Лукашэнкі. Некалі на патрабаваньне горадзенцаў спыніць раскраданьне з магілаў сьвечак, кветак, вянкоў, адзін міліцэйскі чын адказаў, што ня можа выставіць каля кожнай магілы міліцэйскі нарад. Цяпер вось жа — іншая справа.

■ Расейская газэта „Коммерсант” нядаўна пакрасавалася шчырымі прызнаньнямі. Вось вытрымкі з гэтых шчыраваньняў: „Бюджетный комитет Думы одобрил ратификацию соглашений о введении в 2005 году единой валюты в союзном российско-белорусском государстве. Поскольку этой единой валютой станет российский рубль, **Белоруссии предстоит стать восьмым федеральным округом России. Увеличение территории государства всегда считалось делом полезным. С этой точки зрения присоединение к России Белоруссии – факт отрадный. Так что как только российский рубль и де-факто, и де-юре станет единой валютой, о Белоруссии как о самостоятельном государстве можно будет забыть. … за потерю независимости Минск получит неплохие деньги.”** Вось такі „отрадный факт”.

■ Ніякага жаданьня браць удзел у працэсе валютнай інтэграцыі Расеі і Беларусі Казахстан ня мае. Пра гэта 16 лютага ў інтэрв’ю „Известиям” заявіў старшыня Нацыянальнага банку Казахстана Рыгор Марчанка.

■ Расейская „Новая газета”. Барыс Кагарліцкі: „Касьянаў цьвёрда ведае, што рана ці позна яму ўсё роўна трэба сысьці ў адстаўку. Але шкадаваць яго ня трэба. Нашыя камікадзэ, пачынаючы з часоў Гайдара, чамусьці заўсёды прызямляюцца мякка. У найгоршым выпадку Касьянаву дадуць ачоліць які-небудзь дасьледчы інстытут. Нашая эканоміка ўяўляе сабой „чорную дзірку”, у якую колькі грошай ні запампуй – усё мала. Камусьці здаецца, што яна дастаткова лібэральная, іншыя, наадварот, даказваюць неабходнасьць больш эфэктыўнага рэгуляваньня. Між тым праблема ў самым фундамэнце праблемы. Сучасны расейскі капіталізм – адсталы, залежны, алігархічны, але ён абапіраецца на індустрыяльную эканоміку. Мы маем буржуазію афрыканскага тыпу. Яна ачольвае грамадзтва, сацыяльная структура якога ў цэлым адпавядае эўрапейскім стандартам. Мы маем адсталую эканамічную арганізацыю, якая абапіраецца на параўнальна сучасную (хаця імкліва старэючую) тэхналягічную базу. Пры такім раскладзе нам наканавана „жыць не па сродках” і пастаянна дэградаваць.”

■ Вядомы расейскі пэрсанаж дысідэнцкага руху Сяргей Кавалёў паразважаў у інтэрв’ю агенцыі „ЮС Ньюс” пра саюз нерушымы РФ і РБ: „Саюзы не ствараюцца такога роду пагадненьнямі. Для Масквы палітычна такі саюз нявыгадны. Таму што пры ўсёй ня надта высокай дэмакратычнасьці Масквы Беларусь будзе цягнуць яе назад. (Трэба меркаваць, Кавалёў з расейскімі дысідэнтамі гатовы быў бы ўтварыць значна лепшы саюз). Вось паспрабуйце ўгаварыць каго-небудзь выйсьці з Брытанскай Садружнасьці нацыяў. Нічога не атрымаецца. Там ёсьць выпрацоўка ўзважаных і мудрых асноваў адносінаў хаўрусьнікаў, ступені іх сувязяў і самастойнасьці. Гэта робіцца на практычным узроўні, павольна, паступова, пры ўсебаковых кансультацыях спэцыялістаў, а зусім не на палітычнай прапагандзе, як у адносінах Масквы і Менску. Іншая справа, што вашая апазыцыя расколатая і там ёсьць увесь спэктар ад самага малаканструктыўнага краю, накшталт Пазьняка, да сілаў дастаткова стрыманых, выяўлены таксама цэнтар. Той жа *Народны Фронт* мае ня толькі Зянона Пазьняка. Юрый Хадыка падаўся мяне ў гэтым беларускім спэктры чалавекам дастаткова стрыманым і ўзважаным, не нейкім там экстрэмістам. **Мяне трошкі *зьдзіўляе*, што беларуская апазыцыя пастаянна ў галаву вугла ставіць расейскія імпэрскія тэндэнцыі. Я зусім не кажу, што такіх тэндэнцыяў няма. Але не яны вызначаюць сувязі Менску і Масквы. Імпэрскія амбіцыі не тое каб зусім былі ні пры чым, яны іграюць другасную ролю.”** Зьдзіўляецца Кавалёў, зьдзіўляецца Салжаніцын, прыяжджаў быў дысідэнт-пісьменьнік Зіноўеў, абдымаўся з Лукашэнкам і зьдзіўляўся... Беларусам пара здагадацца, што расеец і пасьля 100 гадоў у сталінскім ГУЛАГу будзе апантана агітаваць за свой імпэрскі ГУЛАГ.

■ Начальнік галоўнага ўпраўленьня сацыяльна-выхаваўчай працы міністэрства адукацыі Беларусі Георгі Бутрым адзначыў, што за апошнія 5 гадоў колькасьць захворваньняў дзяцей да 14 гадоў значна паболела. Перад настаўнікамі стваіцца цяпер задача не рыхтаваць дзіця да выкананьня нарматываў, а вучыць, як захоўваць уласнае здароўе.

■ Сэмінар на тэму „Канцэпцыя бясьпечнага пражываньня на забруджаных радыёнуклідамі тэрыторыях” прайшоў 22 лютага ў пасёлку Сьвяцілавічы Веткаўскага раёну на Гомельшчыне. Пасёлак знаходзіцца ў зоне з радыяцыяй звыш за 15 кюры на квадратны кілёмэтр, але тут жывуць каля тысячы чалавек. Абмяркоўваліся праблемы: правядзеньне дэзактывацыі падвор’яў (во дзіва, практыка даўно паказала, што рабіць гэта бясэнсоўна), атрыманьне радыяцыйна чыстай прадукцыі (і гэта лухта), дынаміка зьмяненьня радыяцыйнага

фону ў мясцовасьці (ужо вядома, што гэтая дынаміка – на стагоддзі). Тэарэтызавалі сярод падвопытных веткаўцаў прадстаўнікі шэрагу беларускіх установаў у рамках праекту па рэабілітацыі пасёлку (успомнім пасьмяротную хрушчоўскую рэабілітацыю ахвяраў культу) пад кіраўніцтвам дырэктара дасьледчай фірмы з Оксфарду англічаніна Патрыка Грэя. Толькі няма зьвестак, ці пасяліўся рэабілітатар Грэй са сваёй сям’ёй у пасёлку Сьвяцілавічы. Хутчэй за ўсё — не. Ды й грант скончыўся. (Да чарговай „канцэпцыі”.)



***Сьцягі над вадой. Пінск.***

■ Памочніца прэзыдэнта ЗША па нацыянальнай бясьпецы *Кандалеза Райс* дала першае пасьля ўступленьня на пасаду інтэрв’ю. Яна заявіла сярод іншага: *„Я не адабрала палітыку адміністрацыі Клінтана ў адносінах да Расеі. Асабліва што тычыцца эканамічнай дапамогі Маскве ў той перыяд, калі ўсім ужо было вядома, што тамашняя сістэма разьедзеная карупцыяй і злачыннасьцю. Я не супраць таго, каб падтрымліваць пераходны пэрыяд, але неабходна, каб са свайго боку расейцы ясна дэманстравалі сваё жаданьне рухацца па шляху рэформаў. Я мяркую, што Расея будзе ўсё больш набліжацца да арабскіх краінаў, да Ірана. У рэшце рэшт такая палітыка прывядзе яе да адмовы ўносіць свой уклад у справу па захаваньні міру. Я шчыра лічу, што Расея ўяўляе небясьпеку для Захаду наагул і для нашых эўрапейскіх хаўрусьнікаў у прыватнасьці. Ні яны, ні мы яшчэ не ўсьвядомілі ў поўнай меры тую небясьпеку, якую мае ядзерны арсэнал і балістычныя сродкі дастаўкі Крамля. Мы маем усе прычыны непакоіцца аб магчымым распаўсюджваньні ядзернай тэхналёгіі з Расеі. З 1996 г. мы вядзем дыялог паміж Расеяй і НАТО з мэтай кампэнсаваць пашырэньне НАТО ў Цэнтральнай Эўропе. І вось вынік: падчас вайны ў Косава мы запрашалі прэм’ера Прымакова на кожнае паседжаньне, але ўрэшце рэшт зразумелі, што ён ня меў ніякога жаданьня супрацоўнічаць з намі! Расейская эканоміка знаходзіцца ў такім стане, што баюся, у выніку новых трасеньняў расейцы возьмуцца за замежных інвэстараў і абкладуць іх непамернымі падаткамі. Яны на гэта здольныя! Лічу, што яны не ўяўляюць сабе тых разбуральных наступстваў, да якіх прывяло іх рашэньне пра дэфолт у 1998 г. Яны не разумеюць, што гэтая катастрофа можа затрымаць іх пераход да рынычных адносінаў на гады і нават дзесяцігоддзі. Наша найбольшая памылка ў тым, што мы меркавалі, што дапамога МВФ разам з прыватнымі капіталаўкладаньнямі здолее пераўтварыць былую савецкую Расею ў краіну з рынкавай эканомікай. Гэтая памылка каштавала нам недзе 50 мільярдаў даляраў.* ***Гэтыя грошы зьніклі, выпарыліся.*** *Зразумейце мяне правільна: я лічу Расею нашым партнёрам, нават хаўрусьнікам. Але таксама ведаю, што ў пэўны момант яе інтарэсы ўвойдуць у супярэчнасьць з нашымі.”*

■ Жыльлёвая праблема на вякі. 34% жыхароў Гарадзеншчыны жывуць сёньня ў дамах, пабудаваных у 1961-80 гг.; 10,6% — убудынках, пабудаваных яшчэ да 1945 г.; і толькі 2,9% — у дамах, збудаваных пасьля 1995 г. Асобныя кватэры маюць 48,3% насельніцтва вобласьці. Пятая частка жыхароў ня мае ўласнага жыльля – яны жывуць у інтэрнатах, на кватэры альбо занялі непрыстасаваныя і аварыйныя памяшканьні.

■ Лябедзьку перасадзілі „на табурэтку”. На паседжаньні Пастаяннага камітэту Парляманцкай Асамблеі АБСЭ, што прайшло 23-24 лютага ў Вене, Беларусь афіцыйна не прадстаўляў ніхто. Быў прыняты „нулявы варыянт”. Крэслы беларускай дэлегацыі засталіся пустымі. ***З гэтага вынікае, што, на думку эўрапейскай супольнасьці, на сёньня ў Беларусі не існуе дэмакратычна абранага дзейнага парляманту.*** (Тое, пра што даўно папярэджваў Зянон Пазьняк, зьвяртаючыся да ВС 13-га скліканьня – стала рэчаіснасьцю). Прадстаўнік ад ВС-13 камуніст Віктар Хоміч паведаміў, што спачатку разглядалася магчымасьць, каб да ліпеня ў ПА АБСЭ прысутнічалі адразу дзьве дэлегацыі ад Беларусі. Але такое рашэньне было заблякаванае расейскай дэлегацыяй. Расейцы вядуць стратэгічную гульню па выцісканьню ВС-13 з міжнароднай арганізацыі і падобна паступова дамогуцца свайго. У гэтым іх актыўна падтрымлівае дэлегацыя Арменіі.

***Валеры БУЙВАЛ***

# PODSUMOWANIE

Ten numer biuletynu zawiera sporo materiałów o katastrofie czernobylskiej. Minęło już 15 lat nuklearnego męczeństwa Narodu Białoruskiego i teraz wyraźnie widać jak polityka neokolonialna Moskwy i jej kreatury – Łukaszenki doprowadzi do zagłady narodowej całe społeczeństwo wykorzystując świadomie fatalne wyniki eksplozji na stacji Czernobylskiej.

Właśnie o tym pisze doktor ***Uladzimier Starczanka*** docent na Uniwersytecie w Homlu w artykule pod tytułem *„Wielka Wojna Czernobylska”*. Powołując się na różne badania, diagramy i wykresy demograficzne autor dowodzi, że przyczyny zmniejszenia ludności na Białorusi są związane z katastrofą czernobylską. Zwraca się też uwagę na wyrafinowaną politykę w tej dziedzinie reżimu Łukaszenki i jego moskiewskich opiekunów.

Jeżeli radykalnie nie zapobiegnie się stworzonej sytuacji, nie uchyli się przyczyny „genocydu Czernobla” (przede wszystkim polityczne), naród białoruski nie będzie miał przyszłości. Naród poprostu umrze.

Sytuacja rzeczewiście tragiczna. Społeczeństwo białoruskie musi walczyć o istnienie (jako ekzystencję) nie tylko z dyktaturą, a reżimem promoskiewskim, ale i z całą rosyjską wielkomocarstwową polityką i z międzynarodową potęgą MEGATE.

O tym szmym mówi w swoim krótkim oświadczeniu czernobylskim *„15 lat tragedii”* ***Zianon Paźniak*** nawołując do podjęcia walki społecznej o przyszłość i istnienie całego narodu.

Jak zawsze jest w biuletynie stałe działy: *„Kronika łamania praw Białorusinów”* i *„Białorusini pod okupacją”*, opisane wydarzenia w Mińsku i innych miastach w całej Białorusi, gdzie łamane są prawa obywateli, Konstytucja i prawo białoruskie.

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**